ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ПАНЯДЗЕЛАК, 22 ЖНІЎНЯ 1938 г. № 46 (388) ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ВЫСОКАЕ І ГАНАРОВАЕ ЗВАННЕ — ГРАМАДЗЯНІН СССР

Вярхоўны Совет СССР на пасяджэннях Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей учора зацвердзіў аднагалосна закон «Аб грамадзянстве СССР». Гэты закон асноваи на Сталінскай Канстытуцыі СССР. Ен устанаўлівае адзінае саюзнае грамадзянства для грамадзян усіх Саюзных рэспублік. Ен дакладна вызначае, хто з'яўляецца грамадзянамі СССР, і ўстанаўлівае парадак прыёму ў грамадзянства СССР і выхаду з яго.

Закон «Аб грамадзянстве СССР» мае велізарнае палітычнае значэнне не толькі для нашай дзяржавы, але і далёка за межамі яе. Недарма абмеркаванне гэтага закона ў Вярхоўным Совеце адбывалася з такім натхненнем, з такім патрыятычным уздымам. Пачуццём вялікага гонару былі напоўнены прамовы ўсіх выступаючых дэпутатаў. Абмеркаванне і зацвярджэнне закона «Аб грамадзянстве СССР»—гэта новае ўсенароднае і міжнароднае таржаство совецкай дэмакратыі.

Вярхоўны Совет СССР зацвярджае з новай сілай поўную роўнасць усіх грамадзян, незалежна ад нацыянальнасці і расы, незалежна ад колеру скуры і мовы, устанаўлівае адзінства грамадзянства ўсіх Саюзных рэспублік. Ен робіць гэта ў такі час, калі ў радзе капіталістычных краін лютуе фашызм, які закідвае граззю ўсе асталкі буржуазнай дэмакратыі; калі старыя парламентарныя дзяржавы ў бяссіллі здаюць пазіцыі фармальнай роўнасці, калі з нечуваным цынізмам абвяшчаюцца чорнасоценныя, звярыныя дэкларацыі гвалту над народамі, над асобай, над паняццямі свабоды і незалежнасці.

З законным пачуццём гордасці дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, выбраннікі свабоднага совецкага народа, зацвярджаюць высокае і ганаровае званне совецкага грамадзяніна. А ў капіталістычным свеце пры злачынным патуранні буржуазных урадаў, выхвальваючыхся старымі сваімі, даўно абвяшчаўшымі дэкларацыямі «незалежнасці», «правоў чалавека і грамадзяніна», «хартыямі вольнасцей», народ Абісініі пазбаўляецца свабоды і залічваецца ў халопы і рабы італьянскай буржуазіі, народ Аўстрыі траціць усе правы грамадзянства і захвачан у рабства берлінскіх фінансавых заправіл, грамадзянскія правы народаў Іспаніі і Кітая нагла і бесцырымонна папіраюцца інтэрвентамі, фашысцкімі захватчыкамі, і той-жа лёс пагражае чэхаславацкаму народу.

Якія народы не трапечуць за свой лёс у капіталістычным свеце? У якой капіталістычнай краіне само слова «грамадзянін» не стала насмешкай над элементарнымі паняццямі аб справядлівасці і чалавечнасці?

«Грамадзяне» буржуазных дзяржаў жывуць у страшэнных умовах хранічнага беспрацоўя і з глыбокай трывогай глядзяць на будучыню сваіх дзяцей. «Грамадзяне» найбагацейшых краін асуджаны на галодную смерць, на жалкую старасць, на бяссільнае існаванне сярод скарбаў, якія няма каму прадаваць.

Вялікая социялістычная рэвалюцыя вырагавала народы Совецкага Саюза ад бедстваў, крызісаў, ад галечы і беспрацоўя. Партыя большэвікоў пад кіраўніцтвам вялікіх стратэгаў рабочага класа Леніна і Сталіна выратавала народ Совецкага Саюза ад гнёту, эксплаатацыі, міжнароднага разбою. На вялікай нашай радзіме развяваецца чырвоны сцяг комунізма, таржаствуе ўлада рабочых і сялян.

З нянавісцю, але і са страхам і з мімавольнай павагай глядзіць міжнародная буржуазія на социялістычную дзяржаву, якая па аб'ёму сваёй прамысловасці, па сваёй тэхнічнай аснашчонасці, па народнаму багаццю ўжо выйшла на адно з першых месц у свеце.

Совецкі грамадзянін — гэта раўнапраўны творац і ўдзельнік вялікага социялістычнага будаўніцтва. Рускія людзі, украінцы, беларусы, азербайджаны, грузіны, армяне, таджыкі, узбекі, туркмены, казахі, кіргізы і яшчэ многія іншыя дружна і радасна ўзводзяць вялікую будоўлю социялізма. Кожны любіць сваю радзіму, свой народ, сваю мову—і ўсе разам, як совецкія грамадзяне, беззаветна адданы агульнай радзіме-мацеры — вялікай совецкай краіне.

Свабодны совецкі грамадзянін! Ен адчувае за сваёй спіной магутную дзяржаву, якая ў любы момант устане на яго абарону, калі наглы вораг адважыцца пасягнуць на правы совецкага грамадзяніна. Магутным гневам загарэлася ўся совецкая зямля, усе совецкія грамадзяне, калі японскія самураі папрабавалі працягнуць брудную лапу да совецкіх уладанняў.

Грамадзянін... Ніколі царская Расія не ведала гэтага слова. Яна здаўна дзялілася на паноў і на халопаў, і толькі за вялікія грошы тоўстасумыя купцы куплялі «ганаровае грамадзянства». Рабочы клас Расіі, кіруемы партыяй Леніна—Сталіна, зрабіў усіх працоўных сапраўднымі грамадзянамі.

Перамога социялізма дала совецкаму грамадзяніну тое, без чаго гэта званне астаецца пустым гукам у капіталістычных краінах. Грамадзянін СССР — моцны чалавек. Ен моцны багаццямі сваёй краіны, якія належаць народу, толькі народу. Ен моцны сваім правам на гарантаваную працу, сваім непасрэдным удзелам у вялікай творчай працы. Ен моцны сваім правам на асвету, сваімі дзецьмі, перад якімі раскрыта шырокая дарога ў шчаслівае жыццё. Ен моцны сваёй матэрыяльнай забяспечанасцю. Ен моцны сваёй горача любімай Чырвонай Арміяй, моцны сваёй партыяй Леніна — Сталіна, несакрушальным саюзам партыйных і непартыйных большэвікоў.

Совецкае гордае грамадзянства — яно ў нашых святах і таржаствах, у вясёлых песнях шчаслівага народа, у мудрых сказаннях народных спевакоў і сказіцеляў. Яно — у грознай абароне нашай бацькаўшчыны. Яно — у радаснай стаханаўскай працы. Яно — ва ўсенароднай вучобе.

Няма другой краіны ў свеце, у якой было-б так развіта пачуццё асабістага дастоінства. У Совецкім Саюзе ніхто «не ламае шапкі». Слова «грамадзянін» стала формай звароту, знамянуючай правы роўных на ўзаемную павагу. Гэта — совецкая дэмакратыя ў быту.

Як аб гонары і высокім дастоінстве гаварылі дэпутаты Вярхоўнага Совета аб званні грамадзяніна СССР. Пазбаўленне гэтага звання, гэта — найцяжэйшае пакаранне. Совецкі народ няўмольна выкаргае з свайго асяроддзя здраднікаў радзімы, прадажнікаў, агентаў буржуазіі.

Вялік гонар быць грамадзянінам СССР, насіць гэта высокае званне. Вяліка радасць быць удзельнікам социялістычнага будаўніцтва ў Совецкай краіне. Вялікі гонар жыць і працаваць у краіне, першым грамадзянінам якой, самым любімым з'яўляецца таварыш Сталін!

(«ПРАВДА»).

РАДЗІМА

Радзіма!
Прайшоў твае долы я ўперак і ўдоўж,
Прайшоў ад заходняй да ўсходняй граніцы
У летнюю спёку, у восеньскі дождж,
У буру зімовую і навальніцу.

Радзіма!
Я знаю Каўказ, велічавы Казбек,
Дзе ў белым адзенні іскрацца вяршыны,
Каскады, істужкі бліскучыя рэк,
Крутыя абвалы, між скалаў цясніны.

Радзіма!
Я знаю дзівосны, як казка, Усход:
Гарбатыя сопкі, лясы і прасторы,
Амур легендарны, што дань сваіх вод
Трывожна нясе у Охоцкае мора.

Радзіма!
Я знаю тваю Беларусь — авангард,
Надзейны фарпост на граніцы са зморкам:
Лясы і дарогі, дзе сцены прысад
Красою біярозавай цешаць мне вока.

Радзіма.
Ты ўся прада мною, ты ўся наяву—
У бронзу, у кветкі і чырвань адзета.
Гляджу я з любоўю на горад Маскву,
Што светлым стаіць маяком над сусветам.

Радзіма!
Мне зоры твае асвятлялі пуці,
Вятры пракладалі шырока дарогу,
Ты мне гаварыла заўсёды ісці,
Наперад ісці, не баяцца нічога.

Радзіма!
Ад холаду, сцюжы, у лютасць завей
У лес твой густы я ішоў захавацца,
Мяне прытуляў ён нібы да грудзей
Ласкавага сына ласкавая маці.

Радзіма!
У летнюю пору ад ярасці спёк
Ішоў я са смагі, як леў, да крыніцы,
І ты мне давала тады халадок,
Давала з глыбінь тваіх чыстых напіцца.

Радзіма!
Я вырас магутны. Ты мне даручы
Быць воінам смелым, — давай толькі зброю
Свяшчэнны твой мір на зямлі берагчы
Я ўпэўнена буду надзейнай рукою.

Міхась КАЛАЧЫНСКІ.

ДРУГАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР 1-га СКЛІКАННЯ

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ 15 жніўня 1938 г.

15 жніўня, у 11 гадзін дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося другое сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

З дакладам па пункту другому парадку дня Сесіі — аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік» выступіў Народны Камісар Юстыцыі СССР тав. **Рычкоў** Н. М.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА 15 жніўня 1938 г.

15 жніўня, у 2 гадзіны дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося пятае пасяджэнне Совета Саюза.

Старшынствуе — Намеснік Старшыні Совета Саюза дэпутат **Лысенка** Т. Д.

Совет Саюза заслухоўвае садаклад Члена Камісіі Заканадаўчых меркаванняў дэпутата **Шагімарданава** Ф. В. па пункту другому парадку дня — аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Пасля садаклада Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совет Саюза пераходзіць да спрэчак.

У спрэчках выступілі Член Вярхоўнага суда СССР тав. **Галякоў** І. Т. і дэпутат **Андрэева** З. А. (Чэбаксарская акруга, Чувашская АССР).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ 15 жніўня 1938 г.

15 жніўня, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося пятае пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат Н. М. **Швернік**.

Совет Нацыянальнасцей заслухоўвае садаклад Старшыні Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совета Нацыянальнасцей дэпутата П. А. **Тюркіна** па пункту другому парадку дня аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Пасля садаклада Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совет Нацыянальнасцей пераходзіць да спрэчак.

У спрэчках выступілі дэпутат М. В. **Гарбачоў** (Сарокская акруга, Карэльская АССР), народны камісар юстыцыі РСФСР тав. Я. П. **Дзмітрыеў**, дэпутаты Г. Н. **Бежулін** (Гармская акруга, Таджыкская ССР), В. П. **Ефрэмаў** (Севастопальская акруга, Крымская АССР), С. Д. **Іонычаў** (Геок-Тэпінская акруга, Туркменская ССР), Старшыня Вярхоўнага суда РСФСР тав. А. П. **Саладзілаў**, дэпутат М. С. **Манукянц** (Джэрабердская акруга, Нагорна-Карабахская аўтаномная вобласць), намеснік старшыні Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР тав. І. Т. **Нікітчанка** і дэпутат К. А. **Бармашаў** (Семіпалацінская акруга, Казахская ССР).

ДЗЕННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ 15 жніўня 1938 г.

НА СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

15 жніўня, у 11 гадзін дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося другое сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Старшынствуючы — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат Швернік Н. М. прадастаўляе слова для даклада Народнаму Камісару Юстыцыі СССР тав. **Рычкову** Н. М.

— Сталінская Канстытуцыя, — гаворыць тав. Рычкоў,—паднімае правасуддзе і суд на нябачаную ў гісторыі чалавечага грамадства вышыню. Праект «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік», унесены на разгляд Другой Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, і зыходзіць з задач совецкага правасуддзя, устаноўленых у раздзеле 9 Канстытуцыі. Ен прадугледжвае далейшае ўмацаванне совецкага суда.

— У царскай Расіі,—прадаўжае тав. Рычкоў,—класавая прырода суда, прадажнасць яго чыноўнікаў знайшлі трапнае адлюстраванне ў прыказках народа. «Где суд, там и неправда» — так вызначаў народ «справядлівасць» і «незалежнасць» царскага суда. «С сильным не борись, с богатым не судись», гаварыла руская прыказка, трапна адлюстроўваючы класавы характар царскага суда. «Не иди в суд с одним носом, а иди с приносом», гаварылі ў царскай Расіі, характарызуючы тым самым прадажнасць, хабарніцтва і вымагацельства, якія працвіталі ў царскім судзе і працвітаюць цяпер у судах буржуазных краін.

— Зараз у фашысцкіх краінах, асабліва ў Германіі і Італіі, — адзначае тав. Рычкоў,—суды ператвораны фашысцкімі заправіламі ў простыя засценак для расправы з працоўнымі. Фашысцкія суды—гэта ганебная камедыя, гэта—грубыя здзекі над правасуддзем. У фашысцкіх краінах пануе сваволле і паліцэйскі разгул, які адкрыта і прама папірае свабоду і дастоінства асобы.

Совецкі суд заклікан ахоўваць шчаслівае, свабоднае і радаснае жыццё совецкага народа, заваяванае ім у лютых баях пад выпрабаваным кіраўніцтвам комуністычнай партыі і пад мудрым правадзіцельствам вялікага Сталіна. **(Бурныя, працяжныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю).**

Тав. Рычкоў падрабязна спыняецца на праекце Палажэння аб судаўстройстве, які ўлічвае прайшоўшыя ў нашай краіне велізарныя змены з часу выдання асноў судаўстройства ў 1924 годзе.

Новы праект Палажэння аб судаўстройстве забяспечвае далейшае ўмацаванне совецкага суда, як магутнай зброі дыктатуры рабочага класа, далейшую дэмакратызацыю суда ў дакладнай адпаведнасці з патрабаваннямі Сталінскай Канстытуцыі.

Правасуддзе ў СССР мае сваёй задачай абарону ад усякіх пасягацельстваў:

а) устаноўленага Канстытуцыяй СССР і Канстытуцыямі Саюзных і Аўтаномных рэспублік грамадскага і дзяржаўнага ладу СССР, социялістычнай сістэмы гаспадаркі і социялістычнай уласнасці;

б) палітычных, працоўных, жыллёвых і іншых асабістых і маемасных правоў і інтарэсаў грамадзян СССР, гарантаваных Канстытуцыяй СССР і Канстытуцыямі Саюзных і Аўтаномных рэспублік;

в) правоў і інтарэсаў дзяржаўных устаноў, прадпрыемстваў, калгасаў, кааператыўных і іншых грамадскіх арганізацый.

Правасуддзе ў СССР мае сваёй задачай забеспячэнне дакладнага і няўхільнага выканання совецкіх законаў усімі ўстановамі, пасадавымі асобамі і грамадзянамі СССР.

Дакладчык гаворыць далей аб выхаваўчай рабоце совецкага суда, які, пры-



На другой Сесіі Вярхоўнага Совета СССР: В. М. МОЛАТАЎ гутарыць з прафесарам-ордэнаносцам Н. Н. БУРДЭНКА і Прэзідэнтам Акадэміі навук УССР акадэмікам А. А. БАГАМОЛЬЦАМ (у цэнтры). (СФ).

мяняючы меры крымінальнага пакарання, не толькі карае злачынцаў, але таксама мае сваёй мэтай іспраўленне і перавыхаванне злачынцаў.

— На варце социялістычнай радзімы, — гаворыць тав. Рычкоў, — на варце гарантаваных Сталінскай Канстытуцыяй правоў грамадзян СССР у нашай краіне стаіць не толькі суд. Гэты ганаровы і слаўны абавязак з гонарам выконваюць нашы органы НКВД пад кіраўніцтвам вернага сталінскага наркома Нікалая Іванавіча Ежова. **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты).**

У поўнай адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР праект Палажэння аб судаўстройстве ўстанаўлівае выбарнасць судоў, незалежнасць суддзяў і падпарадкаванне іх толькі закону, удзел ва ўсіх судах народных засядацеляў, адкрытае разбірацельства спраў на судовых пасяджэннях, права абвінавачваемага на абарону і карыстанне роднай мовай.

Новы праект забяспечвае выкананне патрабаванняў праграмы комуністычнай партыі аб пагалоўным прыцягненні працоўных да адпраўлення судзейскіх абавязкаў. Артыкул 11 праекта Палажэння ўстанаўлівае, што суддзямі і народнымі засядацелямі могуць быць усе грамадзяне, якія карыстаюцца выбарчым правам. Артыкул 6 праекта Палажэння ўстанаўлівае ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, што суддзі незалежны і падпарадкоўваюцца толькі закону.

Аслабаненне суддзяў ад пасады і народных засядацеляў ад іх абавязкаў дапускаецца не інакш, як па адкліканню выбаршчыкаў, а таксама ў сілу адбыўшагася аб іх прыгавору суда. Аб гэтым гаворыць арт. 17.

У адпаведнасці з артыкулам 111 Канстытуцыі СССР, праект Палажэння ўстанаўлівае галоснасць працэса ў совецкім судзе, з забеспячэннем правоў абвінавачваемага на абарону.

Народныя суды, згодна артыкула 109 Канстытуцыі СССР, выбіраюцца грамадзянамі раёна на падставе ўсеагульнага, прамога і роўнага выбарчага права пры тайным галасаванні—тэрмінам на 3 годы. Такім чынам, дасягаецца нябачаная да гэтага часу дэмакратызацыя народнага суда.

Акруговыя, Абласныя і Краявыя суды і суды аўтаномных абласцей выбіраюцца адпаведнымі Советамі Дэпутатаў Працоўных тэрмінам на 5 год, Вярхоўныя суды Аўтаномных і Саюзных рэспублік — Вярхоўнымі Советамі гэтых рэспублік таксама на 5 год, Вярхоўны суд СССР і спецыяльныя суды (ваенныя трыбуналы, лінейныя суды чыгуначнага і воднага транспарта) выбіраюцца на 5 год Вярхоўным Советам СССР. Існаваўшыя некаторыя абмежаванні для заняцця пасады суддзі адмяняюцца.

Выбары народных засядацеляў робяцца ў тым-жа парадку і на той-жа тэрмін, што і выбары пастаянных суддзяў. На ўвесь час удзелу народнага засядацеля ў судзе за ім захоўваецца заработная плата.

Праект Палажэння ўстанаўлівае, што судовыя прыгаворы, рашэнні і вызначэнні, уступіўшыя ў законную моц, могуць быць апратэставаны толькі Пракурорам СССР або Пракурорам Саюзнай рэспублікі, Старшынёй Вярхоўнага суда СССР і старшынёй Вярхоўнага суда Саюзнай рэспублікі.

— Праект Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік, — заканчвае свой даклад тав. Рычкоў, — паказвае працоўным усяго свету, што толькі ў совецкай краіне можа быць створан сапраўды народны, сапраўды дэмакратычны суд. Няхай ворагі памятаюць, што меч совецкага правасуддзя і надалей будзе трапна і бязлітасна апускацца на галовы тых, хто пасмее падняць сваю брудную руку на шчаслівае жыццё совецкага народа, на квітнеючую, радасную краіну социялізма.

Па сканчэнні даклада тав. Рычкова сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей закрываецца.

У СОВЕЦЕ САЮЗА

15 жніўня, у 2 гадзіны дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адкрылася пятае пасяджэнне Совета Саюза.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета, Народныя Камісары.

У парадку дня — садаклад Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Старшынствуючы — Намеснік Старшыні Совета Саюза дэпутат Т. Д. **Лысенка** прадастаўляе слова для садаклада члену Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза дэпутату Ф. В. **Шагімарданаву**.

— Унесены Советам Народных Камісараў Саюза ССР праект «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік», — гаворыць дэпутат Шагімарданаў, — поўнасцю адказвае патрабаванням вялікай Сталінскай Канстытуцыі.

Тав. Шагімарданаў адзначае надзвычай важнае значэнне для паляпшэння якасці работы судоў прапануемае праектам скарачэнне ліку судовых інстанцый.

Тав. Шагімарданаў заяўляе, што Камісія Заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза рэкамендуе Вярхоўнаму Совету прыняць прапановы, унасімыя праектам. Разам з тым Камісія прапануе ўнесці ў праект некаторыя папраўкі. У прыватнасці, прапануецца змяніць рэдакцыю артыкула 23-га праекта Палажэння аб судаўстройстве. Згодна гэтай рэдакцыі выбранне народных суддзяў і народных засядацеляў праводзіцца па выбарчых акругах, адпавядаючым раёну дзейнасці кожнага народнага суда.

Між тым, выбарчая акруга па выбарах народных суддзяў будзе прадстаўляць сабой не тэрытарыяльную адзінку, а будзе ахопліваць пэўную колькасць насельніцтва. Таму Камісія Заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза прапануе наступную рэдакцыю гэтага артыкула:

«Народныя суддзі і народныя засядацелі выбіраюцца грамадзянамі раёнаў па выбарчых акругах: выбарчая акруга па выбарах народных суддзяў і народных засядацеляў ахватвае ўсё насельніцтва, пражываючае на тэрыторыі дзейнасці дадзенага народнага суда».

Пачынаюцца спрэчкі па дакладу аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Першым выступае член Вярхоўнага суда СССР тав. І. Т. **Галякоў**.

Тав. Галякоў падрабязна спыняецца на значэнні новага Палажэння аб судаўстройстве ў справе далейшага паляпшэння работы судовых органаў. Праект Палажэння аб судаўстройстве, складзены на падставе Сталінскай Канстытуцыі, робіць наш суд яшчэ больш дэмакратычным, яшчэ больш моцна звязаным з працоўнымі масамі.

Тав. Галякоў падрабязна гаворыць аб задачах Вярхоўнага суда СССР.

Заканчваючы сваю прамову, тав. Галякоў гаворыць:

— Праект новага Палажэння аб судаўстройстве з'явіцца моцнай асновай для таго, каб совецкі суд стаў яшчэ больш магутнай зброяй социялістычнай дзяржавы рабочых і сялян у барацьбе за ахову непахісных асноў социялізма супроць пасягацельстваў усіх ворагаў, фашысцкіх наймітаў, за ахову правоў і законных інтарэсаў грамадзян нашай вялікай социялістычнай радзімы.

Затым слова прадастаўляецца дэпутату З. А. **Андрэевай**.

У заключэнне тав. Андрэева выражае ўпэўненасць, што Сесія аднадушна адобрыць і зацвердзіць прадстаўлены праект «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

На гэтым пасяджэнне Совета Саюза заканчваецца.

(Працяг дзенніка гл. на 2-й стар.).

ДРУГАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР 1-га СКЛІКАННЯ

ДЗЁННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ

15 жніўня 1938 года

У СОВЕЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

15 жніўня, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося пятае пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат Н. М. **Швернік**.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

З садакладам аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік» выступае Старшыня Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совета Нацыянальнасцей дэпутат П. А. **Тюркін**.

— Камісія Заканадаўчых меркаванняў, — гаворыць тав. Тюркін, — лічыць, што прадстаўлены праект Палажэння аб судаўстройстве поўнасцю адказвае патрабаванням Сталінскай Канстытуцыі.

Далей тав. Тюркін ад імя Камісіі ўносіць рад дадаткаў і ўдакладненняў да праекта Палажэння. У прыватнасці, артыкул 5 Палажэння прапануецца дапоўніць указаннем, што правасуддзе ў СССР ажыццяўляецца на пачатках адзінага і роўнага для ўсіх суда, незалежна не толькі ад маёмаснага, службовага і социяльнага становішча, але і незалежна ад расавай і нацыянальнай прыналежнасці. Артыкул 21 прапануецца дапоўніць указаннем, што народныя суды вядуць таксама і грамадзянскія справы паісках аб парушэнні жыллёвых правоў.

У заключэнні тав. Тюркін спыняецца на радзе недахопаў у рабоце Народнага Камісарыята Юстыцыі СССР і яго мясцовых органаў.

Затым пачынаюцца спрэчкі па дакладу аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Першым выступае дэпутат М. В. **Гарбачэў**. Адабраючы прадстаўлены праект Палажэння аб судаўстройстве, ён гаворыць, што гэты праект забяспечвае далейшую дэмакратызацыю совецкага суда і паляпшэнне якасці яго работы.

З вялікай прамовай выступае Народны Камісар Юстыцыі РСФСР тав. Я. П. **Дзмітрыеў**. Ён прыводзіць цікавыя даныя аб тым, як разам з ростам культуры і дабрабыту народа ў нашай краіне ў велізарнай ступені змяншаецца злачыннасць.

Слаўная совецкая разведка, узначальваемая сталінскім Наркомам тав Н. І. Ежовым, разграміла асіныя гнёзды фашысцкіх шпіёнаў, аб'яднаўшыхся ў антысовецкі права-трацкісцкі тэрарыстычны блок. Судовым работнікам і ўсім працоўным Совецкага Саюза трэба быць заўсёды на-чаку, каб выкрываць шпіёнаў, дыверсантаў, здраднікаў, якой-бы маскай яны ні прыкрываліся. Трэба ўсімі сіламі дапамагаць органам Наркамунутсправаў ў гэтай ганаровай рабоце.

Тав. Дзмітрыеў асоба падкрэслівае задачы падрыхтоўкі кадраў, бальшэвіцкага правядзення выбараў народных судоў, дапамогі сельскім грамадскім судам і вытворча-таварыскім судам.

Слова атрымлівае дэпутат Г. Н. **Бажулін**. Адабраючы праект Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік, ён заяўляе, што гэты дакумент працоўныя нашай краіны сустрэнуць з глыбокім задавальненнем.

Выступае дэпутат В. П. **Ефрэмаў**, які зварачае сур'ёзную ўвагу Наркамюста і Вярхоўнага суда СССР на неабходнасць выкаранення зацяжкі ў разборы спраў.

— Царскі суд у нацыянальных ускраінах, — гаворыць выступіўшы затым дэпутат С. Д. **Іонычаў**, — быў сродкам самага жорсткага заняволення народаў, сродкам эксплаатацыі, папірання чалавечага дастоінства.

Тав. Іонычаў крытыкуе Народны Камісарыят Юстыцыі СССР за недастатковую работу па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Старшыня Вярхоўнага суда РСФСР тав. А. П. **Саладзілаў** паведамляе, што распрацоўка праекта Палажэння аб судаўстройстве адбывалася пад непасрэдным кіраўніцтвам главы совецкага ўрада таварыша Молатава.

Дэпутат М. С. **Манукянц** напамінае аб тым, што ворагі народа, якія прабраліся ў органы юстыцыі, стараліся падарваць аўтарытэт нашых совецкіх судоў, аслабіць работу судовых органаў па ўмацаванню социялістычнай законнасці, і заклікае ўзмацніць пільнасць у рабоце судоў. Затым ён робіць заўвагу аб нездавальняючай рабоце Наркамюста Азербайджана.

Намеснік Старшыні Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР тав. І. Т. **Нікітчэнка** ў сваім выступленні падкрэслівае, што новае «Палажэнне аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік» дасць магчымасць яшчэ больш умацаваць наш совецкі суд.

Дэпутат К. А. **Бармашоў** гаворыць аб вялікім значэнні падбора кадраў судовых работнікаў.

Пасля выступлення тав. Бармашова пасяджэнне заканчваецца. (БЕЛТА).

* * *

На трыбуне — дэпутат **Худайбергенаў**.

Адзначаючы, што новы праект поўнасцю адпавядае гістарычным асаблівасцям сталінскай эпохі, дэпутат **Катаева** Е. В. выражае ўпэўненасць у тым, што Палажэнне аб судаўстройстве будзе аднадушна прынята Вярхоўным Советам.

Выступае дэпутат **Ледзенцоў** А. П. Ён адзначае сур'ёзныя недахопы ў рабоце народных і абласных судоў. Ён крытыкуе Наркамюст і пракуратуру СССР, не рэагаваўшых з усёй рашучасцю на зацяжку ў разглядзе судовых спраў.

Пасля выступлення тав. Ледзенцова Совет Саюза прымае пастанову—спыніць спрэчкі.

Заключнае слова прадастаўляецца дакладчыку — Народнаму Камісару юстыцыі СССР тав. **Рычкову** Н. М.

— Спрэчкі паказалі,—гаворыць ён,—што праект Палажэння аб судаўстройстве, унесены Советам Народных Камісараў СССР, аднадушна падтрымліваецца ўсімі дэпутатамі Вярхоўнага Совета СССР.

Тав. Рычкоў заяўляе, што ён згодзен з большасцю паправак, унесеных Камісіяй Заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза і выступаўшымі ў спрэчках дэпутатамі.

Дакладчык прызнае крытыку дзейнасці Наркамюста СССР правільнай.

З заключным словам ад Камісіі Заканадаўчых меркаванняў выступае дэпутат **Шагімарданаў** Ф. В. Ён адзначае, што дэпутаты Вярхоўнага Совета былі аднадушны ў сваім падтрыманні праекта Палажэння аб судаўстройстве.

Затым Совет Саюза пераходзіць да галасавання і зацверджання «Закона аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Совет Саюза аднагалосна зацвярджае — па раздзелах, а затым і ў цэлым— «Закон аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Па прапанове дэпутата **Багданава** В. Д. Совет Саюза прымае пастанову— правесці выбары Вярхоўнага Суда СССР, а таксама заслухаць даклад аб праекце закона «Аб грамадзянстве СССР» на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

У СОВЕЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

16 жніўня вечарам, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося шостае пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета, Народныя Камісары.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Старшынствуючы — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М. прадастаўляе слова дэпутату **Бакалдзіну** Ф. Ф.

Адзначаючы вялікія заслугі совецкага суда і пракуратуры, дэпутат Бакалдзін разам з тым крытыкуе недахопы ў іх рабоце.

Наступным выступае дэпутат **Кулаў** К. Д.

— Я поўнасцю далучаюся да прапаноў выступаўшых тут дэпутатаў, адобрыўшых праект Палажэння аб судаўстройстве, — гаворыць тав. Кулаў.

На трыбуне—дэпутат **Мусінскі** В. С. Ён гаворыць аб велізарным значэнні новага Палажэння аб судаўстройстве.

Тав. Мусінскі лічыць, што Наркамюсту трэба асаблівую ўвагу аддаць падрыхтоўцы кадраў.

Дэпутат **Хачыкян-Алекян** А. А., поўнасцю падтрымліваючы прапановы выступаўшых дэпутатаў аб зацвярджэнні праекта Палажэння аб судаўстройстве, спыняецца на недахопах у рабоце органаў юстыцыі і суда.

Слова атрымлівае дэпутат **Біркадзе** Т. М.

Тав. Біркадзе прапануе смялей вылучаць лепшы жаночы актыў на работу ў судовыя органы.

Пасля выступлення старшыні Маскоўскага абласнога суда тав. **Буканава** В. В. спрэчкі спыняюцца.

З заключным словам выступіў дакладчык — Народны Камісар юстыцыі СССР тав. **Рычкоў** Н. М.

— Спрэчкі паказалі, — гаворыць тав. Рычкоў, — што праект Палажэння аб судаўстройстве, унесены Советам Народных Камісараў СССР, аднадушна падтрымліваецца дэпутатамі Вярхоўнага Совета.

На пасяджэннях Совета Нацыянальнасцей Камісіяй Заканадаўчых меркаванняў і выступаўшымі дэпутатамі былі ўнесены папраўкі і дапаўненні, значна ўдакладняючыя асобныя палажэнні праекта і паляпшаючыя яго рэдакцыю. Тав. Рычкоў заяўляе, што з большасцю гэтых паправак і дапаўненняў ён упаўне згодзен і лічыць неабходным іх прыняць.

У заключэнне тав. Рычкоў гаворыць, што ён прызнае зусім правільнай крытыку недахопаў у рабоце Народнага Камісарыята юстыцыі СССР і паведамляе аб мерах, прынятых і прымаемых для знішчэння раду недахопаў, адзначаных у выступленнях дэпутатаў.

Выступіўшы з заключным словам Старшыня Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Тюркін** П. А. адзначыў аднадушную падтрымку ўнесенага ўрадам праекта Палажэння аб судаўстройстве.

Затым Совет Нацыянальнасцей пераходзіць да галасавання і зацвярджэння «Закона аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Совет Нацыянальнасцей аднагалосна зацвярджае — па раздзелах, а затым і ў цэлым — «Закон аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Па прапанове дэпутата **Емцова** В. Я. Совет Нацыянальнасцей прымае пастанову — правесці выбары Вярхоўнага Суда СССР, а таксама заслухаць даклад аб праекце закона «Аб грамадзянстве СССР» на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей». (БЕЛТА).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА
16 жніўня 1938 года

16 жніўня, у 11 гадзін дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося шостае пасяджэнне Совета Саюза.

Старшынствуе — Намеснік Старшыні Совета Саюза дэпутат **Лысенка** Т. Д.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

У спрэчках выступілі дэпутаты **Леонава** О. Ф. (Свердлоўская акруга, г. Масква), **Вышынскі** А. Я. (Вольская акруга, Саратаўская вобласць), **Худайбергенаў** А. (Ташаўзская акруга, Туркменская ССР), **Катаева** Е. В. (Мелекеская акруга, Куйбышаўская вобласць) і **Ледзенцоў** А. П. (Молатаўская акруга, Свердлоўская вобласць).

Па сканчэнні спрэчак Совет Саюза заслухоўвае заключныя словы дакладчыка — Народнага Камісара юстыцыі СССР тав. **Рычкова** Н. М. і садакладчыка — члена Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза дэпутата **Шагімарданава** Ф. В.

Затым Совет Саюза пераходзіць да галасавання і зацверджання «Закова аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Совет Саюза аднагалосна зацвярджае — па раздзелах, а затым і ў цэлым — «Закон аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Па прапанове дэпутата **Багданава** В. Д. Совет Саюза прымае пастанову— правесці выбары Вярхоўнага Суда СССР, а таксама заслухаць даклад аб праекце закона «Аб грамадзянстве СССР» на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ
16 жніўня 1938 года

16 жніўня, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося шостае пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

У спрэчках выступілі дэпутаты **Бакалдзін** Ф. Ф. (Стэрлітамакская акруга, Башкірская АССР), **Кулаў** К. Д. (Алагіра-Ардонская акруга, Паўночна-Асецінская АССР), **Мусінскі** В. С. (Паўночная акруга, РСФСР), **Хачыкян-Алекян** А. А. (Эрыванская прыгарадная акруга, Армянская ССР), **Біркадзе** Т. М. ((Капандзібская акруга, Аджарская АССР) і старшыня Маскоўскага абласнога суда тав. **Буканаў** В. В.

Па сканчэнні спрэчак Совет Нацыянальнасцей заслухоўвае заключныя словы дакладчыка — Народнага Камісара юстыцыі СССР тав. **Рычкова** Н. М. і садакладчыка — Старшыню Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совета Нацыянальнасцей дэпутата **Тюркіна** П. А.

Затым Совет Нацыянальнасцей пераходзіць да галасавання і зацверджання «Закона аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік»

Совет Нацыянальнасцей аднагалосна зацвярджае — па раздзелах, а затым і ў цэлым — «Закон аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Па прапанове дэпутата **Емцова** В. Я. Совет Нацыянальнасцей прымае пастанову — правесці выбары Вярхоўнага Суда СССР, а таксама заслухаць даклад аб праекце закона «Аб грамадзянстве СССР» на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

ДЗЁННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ
16 жніўня 1938 года

У СОВЕЦЕ САЮЗА

16 жніўня, у 11 гадзін дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адкрылася шостае пасяджэнне Совета Саюза.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб праекце «Палажэння аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік».

Старшынствуючы — Намеснік Старшыні Совета Саюза дэпутат **Лысенка** Т. Д. прадастаўляе слова дэпутату **Леонавай** О. Ф.

Тав. Леонава горача вітае праект Палажэння аб судаўстройстве, у якім гаворыцца аб задачы совецкага суда абараняць ад усякіх пасягацельстваў устаноўлены Канстытуцыяй СССР і Канстытуцыямі Саюзных і Аўтаномных рэспублік грамадскі і дзяржаўны лад СССР, социялістычную сістэму гаспадаркі і социялістычную ўласнасць.

З вялікай увагай выслухоўвае Совет Саюза прамову дэпутата **Вышынскага** А. Я.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
АБ СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ 17 жніўня 1938 г.

17 жніўня, а першай гадзіне дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося трэцяе сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

Вярхоўны Совет СССР прыступае да абмеркавання пункта трэцяга парадку дня Сесіі — выбары Вярхоўнага суда СССР.

Ад совета старэйшын Совета Саюза і ад совета старэйшын Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Бадаеў** А. Е. выступае з дакладам аб выбарах Вярхоўнага суда СССР і ўносіць прапанову аб саставе кандыдатаў, вылучаемых советамі старэйшын у Вярхоўны суд СССР.

Вярхоўны Совет СССР прымае пастанову выбраць Вярхоўны суд СССР у колькасці 45 чалавек. Персанальным галасаваннем Вярхоўны Совет выбірае Старшынёй Вярхоўнага суда СССР тав. **Галякова** Івана Цярэнцьевіча і членамі Вярхоўнага суда СССР таварышоў: **Алексеева** Георгія Алексеевіча, **Абдурахманава** Усмана, **Алексаняна** Алексана Агабекавіча, **Баяркіна** Міхаіла Алексеевіча, **Буленкова** Алексея Алексеевіча, **Буканава** Васілія Васільевіча, **Волк** Екацерыну Архіпаўну, **Гусева** Андрэя Грыгор'евіча, **Дзецістава** Івана Васільевіча, **Дзмітрыева** Леаніда Дзмітрыевіча, **Жукава** Дзмітрыя Якаўлевіча, **Заранава** Івана Міхеевіча, **Іеўлева** Барыса Іванавіча, **Камерона** Петра Алексеевіча, **Караджаеву** Нуры, **Кліміна** Фёдара Арсеньевіча, **Корнева** Івана Владзіміравіча, **Каробко** Раісу Якаўлеўну, **Кандыбіна** Дзмітрыя Якаўлевіча, **Лодысева** Сергея Цярэнцьевіча, **Маліціну** Марыю Нікалаеўну, **Матулевіча** Івана Осіпавіча, **Наумава** Нікалая Аляксандравіча, **Нікітчэнко** Іону Цімафеевіча, **Назвраву** Анну Назараўну, **Орлоўскага** Паўла Ефімавіча, **Огурцова** Івана Канстанцінавіча, **Орлова** Александра Майсеевіча, **Панкратава** Канстанціна Александравіча, **Рахімава** Гаджы Мамедавіча, **Раманаву** Анну Александраўну, **Раманычэва** Міхаіла Грыгор'евіча, **Сакіева** Тюгульбая, **Саладзілава** Андрэя Петровіча, **Сауленко** Любоў Карнееўну, **Смірнову** Еўдакію Васільеўну, **Сусліпа** Андрэя Грыгор'евіча, **Саланіцына** Нікалая Алексеевіча, **Ульрыха** Васілія Васільевіча, **Успенскага** Владзіміра Алексеевіча, **Чагірава** Баймухамеда, **Чэпцова** Александра Александравіча, **Чхэтыані** Афанасія Левановіча, **Шарыфава** Зарыфа.

Ад совета старэйшын Совета Саюза і ад совета старэйшын Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Бадаеў А. Е.** уносіць прапанову аб выбранні народных засядацеляў Вярхоўнага суда СССР у колькасці 20 чалавек. Персанальным галасаваннем Вярхоўны Совет выбірае народнымі засядацелямі Вярхоўнага суда СССР наступных таварышоў: **Авезаву** Мастуру, **Алдабергенава** Тулеу, **Барышэва** Сцяпана Нікіціча, **Белана** Рамана Васільевіча, **Дзюканава** Мірона Дзмітрыевіча, **Ільіна** Грыгорыя Маркелавіча, **Леонаву** Ольгу Фёдараўну, **Малюшына** Нікалая Цімафеевіча, **Мінаева** Васілія Сцяпанавіча, **Мірзаева** Цішабая, **Мір Касімава** Мір Асадулу Мір Алескера оглы, **Малякова** Васілія Фёдаравіча, **Огнёва** Александра Сцяпанавіча, **Орлова** Петра Семёнавіча, **Сметаніна** Нікалая Сцепанавіча, **Цатурана** Цатура Алекавіча, **Цыклауры** Андрэя Васільевіча, **Чулетава** Мурада, **Шамсутдзінава** Галіма Шамсутдзінавіча, **Якуш** Пелагею Астапаўну.

Затым Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да разгляду пункта чацвёртага парадку дня Сесіі — праект закона «Аб грамадзянстве СССР».

З дакладам аб праекце закона «Аб грамадзянстве СССР» выступіў дэпутат **Булганін** Н. А.

ДЗЕННІК СУМЕСНАГА ПАСЯДЖЭННЯ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ 17 жніўня 1938 г.

17 жніўня, у першай гадзіне дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося трэцяе сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Старшынствуе—Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

У парадку дня выбары Вярхоўнага суда СССР і даклад аб праекце закона «Аб грамадзянстве СССР».

Па пытанню аб выбарах Вярхоўнага Суда СССР выступае з дакладам дэпутат **Бадаеў** А. Е.

— Совецкае правасуддзе, — гаворыць тав. Бадаеў, — накіравана на выкараненне ворагаў народа — трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных фашысцкіх шпіёнаў, шкоднікаў, дыверсантаў, забойцаў, здраднікаў радзімы, раскрадальнікаў социялістычнай уласнасці.

Наша правасуддзе разам з тым выхоўвае грамадзян Совецкага Саюза ў духу адданасці радзіме і справе социялізма, у духу дакладнага і няўхільнага выканання совецкіх законаў, у духу беражных адносін да социялістычнай уласнасці, чэсных адносін да дзяржаўнага і грамадскага абавязку і павагі правіл социялістычнага агульнажыцця.

Задачы, якія стаяць перад совецкім судом, велізарны і надзвычай адказны. Таму і людзі, якія пасылаюцца воляй народа для выканання гэтых задач, павінны быць бездакорна чэснымі, вернымі сынамі нашай вялікай радзімы, да канца адданымі справе Леніна—Сталіна, справе социялізма.

Тав. Бадаеў ад імя совета старэйшын Совета Саюза і совета старэйшын Совета Нацыянальнасцей прапануе выбраць Вярхоўны суд СССР у саставе 45 чалавек.

Прапанова прымаецца аднагалосна.

Старшынёй Вярхоўнага Суда СССР аднагалосна выбіраецца тав. **Галякоў** І. Т.

Затым персанальным галасаваннем аднагалосна выбіраюцца 44 члены Вярхоўнага суда СССР.

Ад імя совета старэйшын Совета Саюза і совета старэйшын Совета Нацыянальнасцей тав. Бадаеў прапануе выбраць 20 народных засядацеляў Вярхоўнага суда СССР. Персанальным галасаваннем Вярхоўны Совет выбірае 20 народных засядацеляў Вярхоўнага суда СССР.

Пасля выбараў Вярхоўнага суда СССР Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да абмеркавання чацвертага пункта парадку дня — праекта закона «Аб грамадзянстве СССР».

Слова прадастаўляецца дэпутату **Булганіну** Н. А.

— Закон «Аб грамадзянстве СССР», праект якога я павінен, па даручэнню Соўнаркома Саюза ССР, дакласці Сесіі, — гаворыць тав. Булганін, — мае выключнае значэнне для дзяржавы. Гэты закон устанаўлівае, хто з'яўляецца грамадзянінам Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік.

Кастрычніцкая социялістычная рэволюцыя і Вялікі Ленін устанавілі званне грамадзяніна Совецкай Социялістычнай Рэспублікі. Таварыш Сталін і створаная ім Канстытуцыя нязмерна высока ўзнялі гэта званне грамадзяніна Саюза ССР.

Грамадзянін Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік павінен быць дастойны тых правоў і абавязкаў, якія прадастаўлены яму Сталінскай Канстытуцыяй.

Праект закона аб грамадзянстве зыходзіць з непарушнага прынцыпа роўнапраўнасці грамадзян у социялістычнай дзяржаве, незалежна ад іх нацыянальнасці і расы, а таксама незалежна ад пола, ва ўсіх галінах дзяржаўнага, гаспадарчага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця.

Тав. Булганін адзначае, што фашысцкія краіны ў сваім заканадаўстве аб грамадзянстве пераўзышлі ізуверства і мракабессе сярэдневякоўя. Яны высунулі, як вядома, самую дзікую ў гісторыі чалавецтва «тэорыю» расізма. Лаўры германскага фашызма не даюць спакою італьянскаму фашызму, капіруючаму гітлераўскае мракабессе.

Толькі ў краіне социялізма магчым такі закон аб грамадзянстве, як наш. Гэты закон з'яўляецца самым рэволюцыйным законам аб грамадзянстве ў гісторыі чалавецтва. Наша дзяржава — саюзная дзяржава, створаная на аснове добраахвотнага аб'яднання роўнапраўных Совецкіх Социялістычных Рэспублік. Перад тварам Саюза ўсе Саюзныя рэспублікі — роўнапраўны. У артыкуле І законапраекта перадаецца палажэнне Сталінскай Канстытуцыі, якая ўстанаўлівае адзінае Саюзнае грамадзянства для грамадзян усіх Саюзных рэспублік. Кожны грамадзянін Саюзнай рэспублікі з'яўляецца грамадзянінам Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік. Усе рэспублікі роўны перад Саюзам, усе грамадзяне рэспублік, з'яўляючыся грамадзянамі Саюза, карыстаюцца аднолькавымі правамі.

Праект закона дакладна вызначае, хто з'яўляецца грамадзянамі Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік. Грамадзянамі СССР з'яўляюцца ўсе, састаяўшыя да 7 лістапада 1917 года падданымі былой Расійскай імперыі і не страціўшыя совецкага грамадзянства, а таксама асобы, якія набылі совецкае грамадзянства ва ўстаноўленым законам парадку.

Іншакраінцы, незалежна ад іх нацыянальнасці і расы, прымаюцца ў грамадзянства СССР па іх хадайніцтву Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР або Прэзідыумам Вярхоўнага Совета Саюзнай рэспублікі, у прадзелах якой яны пражываюць.

Выхад з грамадзянства СССР дазваляецца Прэзідыумам Вярхоўнага Совета СССР.

Уступленне ў шлюб грамадзяніна або грамадзянкі СССР з асобай, не маючай грамадзянства СССР, не цягне змены грамадзянства.

Пазбаўленне грамадзянства можа мець месца па прыгавору суда — у выпадках, прадугледжаных законам, або ў сілу асобага ў кожным выпадку Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Заканчваючы свой даклад, тав. Булганін гаворыць, што быць совецкім грамадзянінам — гэта найвялікшы гонар. Гэта значыць разам з усім совецкім народам пад кіраўніцтвам совецкага ўрада, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна працаваць над умацаваннем магутнасці і дабрабыту социялістычнай радзімы.

Быць совецкім грамадзянінам — гэта значыць упэўнена рухацца наперад — да комунізма пад вялікім сцягам Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, пад кіраўніцтвам вялікага правадыра і настаўніка народаў—таварыша Сталіна.

Заключныя словы дакладчыка сустракаюцца гарачай авацыяй усіх дэпутатаў і гасцей у гонар таварыша Сталіна.

Сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей на гэтым заканчваецца. (БЕЛТА).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ
19 жніўня 1938 года

19 жніўня, у 11 гадзін дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося сёмае пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік**

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб праекце закона «Аб грамадзянстве СССР».

У спрэчках выступілі дэпутаты **Вершкоў** П. А. (Тбіліская імя 26 комунараў акруга, Грузінская ССР), **Новікаў** І. В. (Шумерлінская акруга, Чувашская АССР), **Трутнёў** В. К. (Казанская сельская акруга, Татарская АССР), **Петроў** А. С. (Рыбніцкая акруга, Малдаўская АССР), **Ібрагімаў** М. А. (Казахская акруга, Азербайджанская ССР) і **Фёдараў** Е. К. (Наўкацкая акруга, Кіргізская ССР).

Пасля прамовы дэпутата Фёдарава спрэчкі спыняюцца і Совет Нацыянальнасцей заслухоўвае заключнае слова дакладчыка—дэпутата **Булганіна** Н. А.

Затым Совет Нацыянальнасцей пераходзіць да галасавання і зацвярджэння «Закона аб грамадзянстве СССР». Совет Нацыянальнасцей аднагалосна зацвярджае «Закон аб грамадзянстве СССР».

Па прапанове дэпутата **Рачавой** Е. С. Совет Нацыянальнасцей прымае пастанову — заслухаць і абмеркаваць пятае пытанне парадку дня Сесіі— праект закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансіяцыі міжнародных дагавораў», а таксама заслухаць даклад па шостаму пытанню парадку дня — праект закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак» на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ
АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА
19 жніўня 1938 года

19 жніўня, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося сёмае пасяджэнне Совета Саюза.

Старшынствуючы — Намеснік Старшыні Совета Саюза дэпутат **Лысенка** Т.Д.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб праекце закона «Аб грамадзянстве СССР».

У спрэчках выступілі дэпутаты **Карнейчук** А. Е. (Звенігародская акруга, Кіеўская вобласць), **Братаноўскі Г. А.** (Кіраўская акруга, г. Масква), **Ахунбабаеў** Ю. (Андыжанская акруга, Узбекская ССР), прамова якога, сказаная на узбекскай мове, перакладаецца затым на рускую мову, **Образцоў** В. Н. (Рціщэўская акруга, Саратаўская вобласць), **Шагадаеў** М. (Гармская акруга, Таджыкская ССР), прамова якога, сказаная на таджыкскай мове, перакладаецца на рускую мову, **Каракулаў** І. К. (Какпекцінская акруга, Казахская ССР) і **Аліеў** М. І. (Нахічаванская акруга, Азербайджанская ССР).

Пасля прамовы дэпутата Аліева спрэчкі спыняюцца і Совет Саюза заслухоўвае заключнае слова дакладчыка—дэпутата **Булганіна** Н. А.

Затым Совет Саюза пераходзіць да галасавання і зацвярджэння «Закона аб грамадзянстве СССР». Совет Саюза аднагалосна зацвярджае «Закон аб грамадзянства СССР».

Старшынствуючы — дэпутат **Лысенка** Т. Д. прадастаўляе слова Народнаму Камісару юстыцыі СССР тав. **Рычкову** Н. М. Тав. Рычкоў паведамляе, што ў праект закона «Аб судаўстройстве СССР, Саюзных і Аўтаномных рэспублік» Совет Нацыянальнасцей унёс рад змен і рэдакцыйных паправак, супадаючых са зменамі і папраўкамі, прынятымі Советам Саюза. Разам з тым, Совет Нацыянальнасцей некаторыя артыкулы закона прыняў у рэдакцыі некалькі адрозненай ад рэдакцыі гэтых артыкулаў, прынятых Советам Саюза. Тав. Рычкоў уносіць прапанову зацвердзіць указаныя артыкулы Закона ў рэдакцыі, прынятай Советам Нацыянальнасцей. Совет Саюза аднагалосна прымае гэту прапанову.

Па прапанове дэпутата **Малышава** В. А. Совет Саюза прымае пастанову—заслухаць і абмеркаваць пятае пытанне парадку дня Сесіі — праект закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансіяцыі міжнародных дагавароў», а таксама заслухаць даклад па шостаму пытанню парадку дня — праект закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак» на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

ДРУГАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР 1-га СКЛІКАННЯ

ДЗЁННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ

19 жніўня 1938 года

У СОВЕЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

19 жніўня, днём, адбылося сёмае пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада. Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Старшынствуе—Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

У парадку дня —спрэчкі па дакладу аб праекце закона «Аб грамадзянстве СССР».

Першае слова прадастаўляецца дэпутату **Вершкову** П. А.

— Я цалкам і поўнасцю,—гаворыць ён, — падтрымліваю ўнесены Соўнаркомам СССР праект закона «Аб грамадзянстве СССР». Праект закона «Аб грамадзянстве СССР» поўнасцю і цалкам вынікае з Сталінскай Канстытуцыі, гарантуючай грамадзянам СССР права на працу, адпачынак, асвету, на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці.

Наступным выступае дэпутат **Новікаў** І. В.

Адабраючы ўнесены на абмеркаванне праект закона, ён гаворыць:

— Кожны грамадзянін нашай соцыялістычнай радзімы ўпэўнен у сваім заўтрашнім дні. Ён ведае, што заўтра не астанецца без работы, ён штодзённа адчувае сталінскія клопаты аб сабе. Вось чаму з кожным днём расце ў нас армія герояў працы, армія стаханаўцаў прамысловасці, соцыялістычнага земляробства і іншых галін нашай гаспадаркі.

Дэпутат **Трутнёў** В. К. у сваім выступленні падкрэслівае велізарнае дзяржаўнае значэнне закона аб грамадзянстве. Толькі ў краіне соцыялізма магчым такі закон аб грамадзянстве. Дэпутат Трутнёў спыняецца на той частцы праекта закона, якая прадугледжвае пазбаўленне правоў грамадзянства некаторых асоб. Ён падкрэслівае безумоўную правільнасць артыкула 7-га, згодна якога пазбаўленне грамадзянства можа мець месца па прыгавору суда — у выпадках, прадугледжаных законам і ў сілу асобага ў кожным выпадку Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

— Працоўныя нашай краіны — краіны соцыялізма, — гаворыць дэпутат **Петроў** А. С., — з гонарам носяць званне грамадзяніна Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і з пачуццём любві і беззаветнай адданасці радзіме выконваюць абавязак грамадзяніна краіны соцыялізма. Высокае пачуццё грамадзянскага абавязку выразілі ў сваіх бяспрыкладных подзвігах нашы героі — Папанін, Шыршоў, Крэнкель, Фёдараў, нашы гордыя сталінскія сокалы — Чкалаў, Байдукоў, Белякоў, Громаў, Кокінакі, Проскураў і многія іншыя бяспрыкладныя героі і гераіні нашай краіны. Нашы совецкія грамадзяне на граніцах Далёкага Усхода з гонарам, доблесцю і геройствам нанеслі сакрушальныя ўдары па японскіх самураях, якія спрабавалі парушыць граніцы краіны соцыялізма.

Заканчваючы сваё выступленне, тав. Петроў агалашае «ура» вялікаму Сталіну за шчаслівае, радаснае жыццё. Усе дэпутаты і госці ўстаюць і наладжваюць працяглую авацыю ў гонар таварыша Сталіна.

Наступным выступае дэпутат **Ібрагімаў** М. А. Ён гаворыць аб найвялікшых правах, нябачаных у гісторыі чалавецтва, прадастаўленых Сталінскай Канстытуцыяй грамадзянам СССР. Гэтыя правы невымерна ўзнімаюць дастоінства совецкага грамадзяніна. Гэтыя правы совецкага грамадзяніна забяспечваюцца створанымі рэволюцыяй матэрыяльнымі благамі.

Дэпутат **Фёдараў** Е. К. прысвячае сваё выступленне патрыятызму совецкіх грамадзян, сталінскім клопатам аб жывым чалавеку.

Заканчваючы сваё выступленне, тав. Фёдараў прапануе зацвердзіць праект закона «Аб грамадзянстве СССР», — выдатнага дакумента сталінскай эпохі, аснованага на артыкулах Сталінскай Канстытуцыі.

Пасля выступлення тав. Фёдарава спрэчкі спыняюцца.

З заключным словам выступае дакладчык — дэпутат **Булганін** Н. А.

Пасля заключнага слова дэпутата Булганіна Н. А. Совет Нацыянальнасцей аднагалосна зацвярджае «Закон аб грамадзянстве СССР».

Па прапанове дэпутата **Рачавой** Е. С. Совет Нацыянальнасцей пастанаўляе— пятае пытанне парадку дня Сесіі — праект закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансіяцыі міжнародных дагавароў»—заслухаць і абмеркаваць на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей. Па прапанове дэпутата Рачавой Е. С. прымаецца таксама рашэнне — заслухаць даклад па шостаму пытанню парадку дня — праект закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак» на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

У СОВЕЦЕ САЮЗА

Вечарам 19 жніўня ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося сёмае пасяджэнне Совета Саюза.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада. Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Старшынствуе — Намеснік Старшыні Совета Саюза дэпутат **Лысенка** Т. Д.

На пасяджэнні Совета Саюза прадаўжаліся спрэчкі па дакладу аб праекце закона «Аб грамадзянстве СССР».

Выступае дэпутат **Карнейчук** А. Е.

— Праект закона «Аб грамадзянстве СССР» — гаворыць тав. Карнейчук, — з'яўляецца бліскучым адлюстраваннем палітыкі совецкага ўрада, аснованай на вучэнні геніяльных правадыроў рабочага класа—Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна.

Вялікі гонар быць грамадзянінам Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Дзе-б ні быў грамадзянін Совецкага Саюза, ён адчувае за сабою сілу і магутнасць нашай вялікай радзімы.

Народы СССР роўнапраўны і аб'яднаны непахіснай сталінскай дружбай. Совецкая Украіна з'яўляецца непераможным фарпостам соцыялізма на Захадзе.

Тав. Карнейчук прапануе зацвердзіць закон «Аб грамадзянстве СССР».

Дэпутат **Братаноўскі** Г. А. гаворыць, што праект закона «Аб грамадзянстве СССР» накіраван на далейшае ўмацаванне магутнасці нашай соцыялістычнай радзімы.

З прамовай на узбекскай мове выступае дэпутат **Ахунбабаеў** Ю.

— Унесены Советам Народных Камісараў СССР на зацвярджэнне Вярхоўнага Совета СССР праект закона «Аб грамадзянстве СССР» прадстаўляе сабой дакумент вялікага палітычнага значэння. У ім адлюстраваны вынікі гістарычных заваяванняў працоўных СССР.

— Мы, — заяўляе тав Ахунбабаеў,— ганарымся перад усім светам высокім званнем грамадзяніна СССР. Мы ганарымся тымі правамі і абавязкамі, якія яно ўскладае на нас. Народы Узбекскай ССР будуць высока трымаць званне грамадзяніна СССР і з гонарам выконваюць свае абавязкі ў справе далейшага ўздыму народнай гаспадаркі і ўмацавання абароназдольнасці нашай радзімы.

Слова атрымлівае дэпутат **Образцоў** В. Н. Ён гаворыць аб перамозе ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, згуртаваўшай ўсе народы былой царскай Расіі ў адзіную брацкую сям'ю і забяспечыўшай выдатны роскві культуры і навукі ў СССР. Нацыянальнае мастацтва Грузіі, Узбекістана, Украіны ўжо высока праявіла сябе ў тэатры, у літаратуры.

Мы, грамадзяне СССР, з радасцю і задаволеннем прымаем закон аб грамадзянстве.

Мы ведаем, што наша краіна ідзе да ўсё новых і новых перамог і бязмежнага росту пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам вялікага правадыра, які стварыў наш Саюз, нашу армію, нашу Канстытуцыю, пад кіраўніцтвам Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Дэпутат **Шагадаеў** М. гаворыць прамову на таджыкскай мове.

— Словы — Я грамадзянін Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, — гаворыць ён, — гучаць асабліва горда і радасна для кожнага працоўнага нашай радзімы. Гэта і зразумела, бо наша радзіма — першая ў свеце краіна, дзе перамог соцыялізм, дзе поўнакроўна расквітнела свабоднае, соцыялістычнае жыццё.

Аб свяшчэнных правах і абавязках грамадзян Совецкага Саюза гаворыць дэпутат **Каракулаў** І. К. Адабраючы законапраект, ён прыводзіць выдатныя факты росквіту культуры казахскага народа, узроджанага Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыяй. Уважліва слухае зал вершы пяўца Казахстана—Джамбула, цытыруемыя тав. Каракулавым.

...Эпоха убыстрила времени бег.
Встал и расправил горб человек.
Жизнь потекла свободнее рек
В счастливый сталинский век.
И вот возрожденный родной мой народ
Великому Сталину песню поет.
Слова в ней свежи и душисты, как мед,
Песня от сердца идет.

— Няхай моцна запомняць фашысты, —заканчвае пад апладысменты ўсяго зала сваю прамову тав. Каракулаў, — што народы Совецкага Саюза стаяць за мір і адстайваюць справу міру. Але калі спатрэбіцца біць падпальшчыкаў вайны, то ўсе народы нашай краіны разам з Чырвонай Арміяй, з Чырвоным Флотам, Чырвонай авіяцыяй дадуць фашыстам сакрушальны адпор.

Дэпутат **Алієў** М. І. далучаецца да прапановы выступаўшых раней дэпутатаў аб прыняцці закона «Аб грамадзянстве СССР».

Пасля прамовы тав. Аліева спрэчкі спыняюцца.

З заключным словам выступае дакладчык-дэпутат **Булганін** Н. А.

Затым праект закона ставіцца на галасаванне і зацвярджэнне. «Закон аб грамадзянстве СССР» зацвярджаецца Советам Саюза аднагалосна.

Совет Саюза прымае прапанову дэпутата **Малышэва** В. А. — пятае пытанне парадку дня Сесіі — праект закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансіяцыі міжнародных дагавароў» заслухаць і абмеркаваць на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей. Рашано таксама па прапанове дэпутата Малышэва В. А. даклад па шостаму пытанню парадку дня — праект закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак» заслухаць на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей. (БЕЛТА).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ 20 жніўня 1938 года

20 жніўня, у 1 гадзіну дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося чацвёртае сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

Вярхоўны Совет СССР прыступае да разгляду пятага пытання парадку дня Сесіі — праекта закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР».

З дакладам па гэтаму пытанню выступіў Член Камісіі па замежных справах Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Шмідт** О. Ю.

Па скончэнні даклада дэпутат **Двінскі** Б. А. уносіць прапанову — спрэчак па дакладу не адкрываць і ўнесены Камісіяй па замежных справах Совета Нацыянальнасцей законапраект зацвердзіць у цэлым, як поўнасцю адпавядаючы Канстытуцыі СССР.

Старшынствуючы — дэпутат **Швернік** Н. М. даводзіць да ведама палат заяву Старшыні Совета Народных Камісараў СССР тав. **Молатава** В. М. аб тым, што ўрад згодзен з праектам закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР», унесеным на разгляд Сесіі Камісіяй па замежных справах Совета Нацыянальнасцей.

Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да галасавання «Закона аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР». Раздзельным галасаваннем па палатах Вярхоўны Совет СССР аднагалосна зацвярджае «Закон аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР».

Затым Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да разгляду шостага пытання парадку дня Сесіі—праекта закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак», унесенага ў Вярхоўны Совет СССР Камісіяй заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза.

З дакладам аб праекце закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак» выступіў Член Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза дэпутат **Угараў** А. І.

(БЕЛТА).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

АБ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ 20 жніўня 1938 г.

20 жніўня, у 6 гадзін вечара, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося восьмае пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб праекце закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».

У спрэчках выступілі дэпутаты **Іваноў** Г. І. (Урмарская акруга, Чувашская АССР), **Гекман** А. І. (Грымская акруга, АССР Немцаў Паволжа), **Інкіжэкаў** С. Е. (Саралінская акруга, Хакаская аўтаномная вобласць), **Кандаракаў** Ч. М. (Онгудайская акруга, Ойроцкая аўтаномная вобласць), **Еўменава** С. С. (Быхаўская акруга, Беларуская ССР), **Шамсутдзінаў** Г. Ш. (Зялёна-Дольская акруга, Татарская АССР), **Смакулаў** І. А. (Грахоўская акруга, Удмурцкая АССР), **Чэмбулатаў** М. А. (Ардатоўская акруга, Марлоўская АССР), **Фёдараў** А. І. (Сернурская акруга, Марыйская АССР) і **Баталава** М. С. (Комі-Пермяцкая нацыянальная акруга).

Па скончэнні спрэчак Совет Нацыянальнасцей заслухоўвае заключнае слова дакладчыка — дэпутата **Угарава** А. І.

Затым Совет Нацыянальнасцей пераходзіць да галасавання і зацвярджэння «Закона аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак». Совет Нацыянальнасцей аднагалосна зацвярджае «Закон аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».

Па прапанове дэпутата **Пятрова** Г. А. Совет Нацыянальнасцей прымае пастанову — заслухаць і абмеркаваць сёмае пытанне парадку дня Сесіі — Аб Усесаюзнай Сельскагаспадарчай выстаўцы, а таксама восьмае пытанне парадку дня — Аб Указах Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятых у перыяд паміж Першай і Другой Сесіямі і падлягаючых зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР, — на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

ДЗЁННІК ПАСЯДЖЭННЯЎ СЕСІІ

20 жніўня 1938 года

НА СУМЕСНЫМ ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА САЮЗА І СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

20 жніўня, у 1 гадзіну дня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адкрылася чацвертае сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Старшынствуе — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Старшынствуючы — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М. прадастаўляе слова для даклада аб праекце закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР» Члену Камісіі па замежных справах Совета Нацыянальнасцей дэпутату **Шмідту** О. Ю.

— Камісія па замежных справах Совета Нацыянальнасцей,—гаворыць тав. Шмідт, — унесла праект закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР» і даручыла мне далажыць гэты законапраект Вярхоўнаму Совету СССР.

Унасімы праект закона ўдакладняе, якія іменна дагаворы падлягаюць ратыфікацыі.

Дэпутат Шмідт О. Ю. адзначае, што ў буржуазных краінах міжнародныя абавязацельствы далёка не заўсёды выконваюцца. Асабліва энергічную дзейнасць у сэнсе невыканання, аднабаковага растаржэння, грубага разрыву міжнародных дагавораў развіваюць на нашых вачах фашысцкія агрэсіўныя ўрады.

— Міжнародны дагавор, — прадаўжае тав. Шмідт, — падпісаны і ратыфікаваны Прэзідыумам Вярхоўнага Совета Саюза ССР, — не ёсць шматок паперы. Наша краіна ніколі, ні аднаго разу не парушала заключаных ёй міжнародных дагавораў. Заключаныя намі дагаворы непарушны, па-першае, таму, што нашу палітыку накіроўвае вялікая партыя Леніна—Сталіна, а Сталінскае слова цвёрдае. **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты ўсяго зала).** Нашы дагаворы непарушны таму, па-другое, што ў нас не можа быць змен лініі ўрада або змены рабоча-сялянскага ўрада якім-небудзь іншым урадам. Гэтага не можа быць, бо соцыялізм перамог у нашай краіне назаўсёды.

Нашы дагаворы непарушны таму, што мы — мірная дзяржава, багатая, квітнеючая, нам не патрэбны ніякія чужыя землі. Нашы дагаворы непарушны, нарэшце, таму, што мы нікому не дазволім іх парушаць. Мы здолеем абараніць свае граніцы і сваю мірную працу ад любога нападу. Толькі зусім нядаўна мы гэта даказалі на справе, даўшы прадметны ўрок японскай ваеншчыне пры спробе парушыць нашу граніцу. **(Шумныя, працяжныя апладысменты).**

Па скончэнні даклада дэпутата Шмідта слова для прапановы атрымлівае дэпутат **Двінскі** Б. А.

З прычыны таго, што прапановы, унесеныя на Сесію Вярхоўнага Совета Камісіяй па замежных справах Совета Нацыянальнасцей, з'яўляюцца зусім бясспрэчнымі і поўнасцю адпавядаючымі Сталінскай Канстытуцыі, тав. Двінскі прапануе праект закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР» зацвердзіць у цэлым.

Старшынствуючы — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат Швернік Н. М. даводзіць да ведама палат заяву Старшыні Совета Народных Камісараў СССР таварыша Молатава В. М. аб тым, што ўрад згодзен з законапраектам, унесеным Камісіяй па замежных справах Совета Нацыянальнасцей.

Пасля гэтага праект закона «Аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР» ставіцца на галасаванне, якое праводзіцца раздзельна па палатах. Раздзельным галасаваннем Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей аднагалосна зацвярджаюць закон.

Затым Вярхоўны Совет СССР пераходзіць да шостага пытання парадку дня. З дакладам аб праекце закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак» выступае Член Камісіі Заканадаўчых меркаванняў Совета Саюза дэпутат **Угараў** А. І.

Па скончэнні даклада дэпутата Угарава А. І. старшынствуючы — Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М. паведамляе, што абмеркаванне закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак» будзе праводзіцца па палатах.

Сумеснае пасяджэнне Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей абвяшчаецца закрытым. (БЕЛТА).

У СОВЕЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

Вечарам, 20 жніўня, у зале пасяджэнняў Вярхоўнага Совета СССР, у Крэмлі, адбылося восьмае пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей.

У ложах — кіраўнікі партыі і ўрада, Члены Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, Народныя Камісары.

Старшынствуе—Старшыня Совета Нацыянальнасцей дэпутат **Швернік** Н. М.

У парадку дня — спрэчкі па дакладу аб праекце закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак».

Старшынствуючы — дэпутат Швернік Н. М. прадастаўляе слова дэпутату **Іванову** Г. І.

— Многамільённае сялянства нашай краіны, — гаворыць тав. Іваноў, — праверыўшы на дзесятках і сотнях прыкладах выгаднасць калгаснага ладу, пад непасрэдным кіраўніцтвам нашай большэвіцкай партыі Леніна — Сталіна перайшло на соцыялістычную форму гаспадаркі.

— Калгасы нашай краіны, — прадаўжае тав. Іваноў, — прымаюць актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве, забяспечваючы нашу краіну сельскагаспадарчымі прадуктамі, уносячы падаткі, удзельнічаючы ў праведзенні розных гаспадарчых і культурных мерапрыемстваў. Совецкімі законамі ўстаноўлены дзяржаўныя абавязацельствы і для аднаасобных гаспадарак: па падатках, зернапастаўках, мясапастаўках. Аднак, вядома, што аднаасобныя гаспадаркі фактычна часта ўскальзаюць ад выканання гэтых абавязацельстваў і ставяцца, такім чынам, у пераважнае становішча перад калгасамі. Гэта пярэчыць існуючым законам.

Дэпутат **Гекман** А. І. у сваёй прамове спыняецца на велізарных поспехах, дасягнутых калгасамі Аўтаномнай рэспублікі Немцаў Паволжа.

Спыняючыся на прычынах, спрыяўшых ўхіленню аднаасобных гаспадарак ад выканання дзяржаўных абавязацельстваў, дэпутат **Інкіжэкаў** С. Е. адзначае дрэнную работу ў гэтай галіне фінансавых і загатоўчых органаў.

— Праверка ў радзе раёнаў Ойроцкай аўтаномнай вобласці, — гаворыць дэпутат **Кандаракаў** Ч. М.,—паказала, што многія аднаасобныя гаспадаркі не выконваюць абавязковых паставак, ухіляюцца ад выканання іх усялякімі шляхамі і займаюцца спекуляцыяй.

Закон аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак ідзе насустрач пажаданням калгаснікаў.

— Я працую старшынёй калгаса, — гаворыць дэпутат **Еўменава** С. С., — і бачу, дзе аднаасобнікі выкарыстоўваюць сваіх коней, якія даходы ад іх атрымліваюць. Коні многіх аднаасобнікаў выкарыстоўваюцца не для сельскагаспадарчых работ, а ў мэтах спекуляцыйнай нажывы.

— Нямала аднаасобных гаспадарак,— адказвае дэпутат **Шамсутдзінаў** Г. Ш., — трымаюць коней не для апрацоўкі сваёй зямлі, а як сродак спекуляцыйнай нажывы, і пры гэтым усяляк хітруюць ва ўтойванні сваіх даходаў ад дзяржавы.

Вялікае значэнне прадстаўленага законапраекта адзначае ў сваёй прамове дэпутат **Смакулаў** І. А.

Аб выключных перамогах калгаснага ладу гаворыць дэпутат **Чэмбулатаў** М. А.

— Сялянства пераканалася, — гаворыць дэпутат **Фёдараў** А. І., — што толькі калгасны лад дае шчаслівае, культурнае і заможнае жыццё. У мінулым годзе сотні калгаснікаў Марыйскай рэспублікі атрымалі ўраджай ад 18 да 25 цэнтнераў з гектара. У нас, у Марыйскай рэспубліцы, выраслі сотні стаханаўцаў, паказваючых узоры соцыялістычных адносін да працы.

Затым выступае дэпутат **Баталава** М. С. Яна далучаецца да прапановы раней выступаўшых дэпутатаў аб зацвярджэнні законапраекта.

Пасля прамовы тав. Баталавай спрэчкі спыняюцца.

З заключным словам выступае дакладчык — дэпутат **Угараў** А. І.

Затым праект закона «Аб дзяржаўным падатку на коней аднаасобных гаспадарак» ставіцца на галасаванне і зацвярджаецца Советам Нацыянальнасцей аднагалосна.

Дэпутат **Петроў** Г. А. уносіць прапанову — заслухаць і абмеркаваць сёмае пытанне парадку дня Сесіі — Аб Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, а таксама восьмае пытанне парадку дня — Аб Указах Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, прынятых у перыяд паміж Першай і Другой Сесіямі і падлягаючых зацвярджэнню Вярхоўнага Совета СССР, — на сумесным пасяджэнні Совета Саюза і Совета Нацыянальнасцей.

Прапанова дэпутата Петрова прымаецца. Пасяджэнне Совета Нацыянальнасцей на гэтым заканчваецца.

(БЕЛТА).

СВЯТА СОВЕЦКАЙ АВІЯЦЫІ

18 ЖНІЎНЯ НА ТУШЫНСКІМ АЭРАДРОМЕ

З усіх канцоў сталіцы накіраваліся 18 жніўня з раніцы да Тушынскага аэрадрома сотні тысяч масквічоў, падцягнуліся бясконцыя вераніцы аўтамабіляў.

Жыхары сталіцы і калгаснікі навакольных сёл прышлі палюбавацца майстэрствам гордых сокалаў краіны — сталінскіх выхаванцаў, любімцаў і герояў народа, слава аб подзвігах якіх грыміць далёка за межамі нашай радзімы.

На трыбуне Цэнтральнага аэраклуба—таварышы Сталін, Молатаў, Л. М. Кагановіч, Варашылаў, Мікаян, Ежоў, Жданаў, Хрушчоў, Літвінаў, Шкіратаў, Маленкоў, Швернік, Угараў, Булганін, Косараў, Молакаў, Чкалаў, Гаршэнін і інш.

На свяце прысутнічаюць дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР — удзельнікі Другой Сесіі.

Запоўнены ложы дыпламатычнага корпуса. Сярод гасцей — прыляцеўшы напярэдадні ў Маскву выдатны амерыканскі лётчык Чарльз Ліндберг.

Тры гадзіны дня. Павольна і плаўна падымаецца ў вышыню паветраны шар з гіганцкім партрэтам таварыша Сталіна.

Адзін за адным паветраныя шары падымаюць узверх партрэты таварышаў Молатава, Л. М. Кагановіча, Варашылава, Калініна, Андрэева, Мікаяна, Жданава, Ежова і Хрушчова.

Аэрадром агалашаецца гулам матораў. Быстра і чотка адрываюцца ад зямлі каля 100 вучэбных самалётаў «У-2». Брыгадай лёгкаматорных машын камандуе маёр Смураў. За штурваламі машын — пілоты маскоўскіх аэраклубаў, маладыя рабочыя і работніцы, якія навучыліся лётнай справе без адрыву ад вытворчасці.

Услед за брыгадай лёгкіх самалётаў вылятае 9 вучэбна-трэніровачных машын «УТ-2», за імі — 15 самалётаў «УТ-1». Маладыя пілоты маскоўскіх аэраклубаў паказваюць выдатную вывучку. З кожным годам расце і ўдасканальваецца крылатае племя совецкіх людзей!

Не паспяваюць яшчэ гледачы праводзіць вачыма брыгаду лёгкіх машын, як з'яўляюцца новыя эскадрыллі. Ляцяць «паветраныя паязды». Адчапіўшыся ад самалётаў, вялікія безматорныя птушкі кружацца ў небе каруселлю, робяць петлі, спіралі.

Індывідуальны пілатаж змяняецца групавым, групавы — індывідуальным. Адну фігуру замыславацей другой прарабляюць на спартыўных самалётах пілоты Косцін, Растаргуеў і Ісінскі.

Закончылася першае аддзяленне паветранага парада. Маладыя лётчыкі маскоўскіх аэраклубаў прадэманстравалі высокую тэхніку пілатажа, веданне сваёй справы. Яны паказалі свайму народу, што ў любую мінуту гатовы перасесці з вучэбных і спартыўных машын на баявыя машыны.

На змену аэраклубнай авіяцыі прыходзіць Грамадзянскі паветраны флот. Калі над Тушынскім аэрадромам з'яўляецца чырвонакрылы самалёт «Масква», пілатуемы Героем Совецкага Саюза камбрыгам тав. Кокінакі, поле агалашаецца шумнымі апладысментамі ў гонар гордых сокалаў сталінскай эпохі.

Ляцяць паштовыя і пасажырскія самалёты, скорасныя шматмесныя і камфартабельныя машыны, самалёты санітарнай авіяцыі.

У трэцім аддзяленні паветранага парада ваенныя лётчыкі дэманструюць сваю смеласць, мужнасць, адвагу, майстэрства, уменне авалодаць складанай баявой тэхнікай у сучасных умовах паветранага бою.

Да аэрадрома хутка набліжаюцца тры разведчыя самалёты «праціўніка». Яны прабуюць застаць аэрадром знянацку. Але «праціўнік» заўважан. Раздаецца трывога: працяжна гудуць сірэны. Група знішчальнікаў абароны пад камандаваннем Героя Совецкага Саюза палкоўніка тав. Лакеева маланкай падымаецца ў паветра. Шматлікія жэрлы зенітных гармат вялікіх і малых калібраў накіраваны ў неба. З выключнай дакладнасцю б'е зенітная артылерыя па самалётах «праціўніка». Не паспелі скрыцца разведчыкі, праследуемыя авіяцыяй абароны, як з-за лесу раптам паказваюцца штурмавікі. Зноў грукаціць зенітная артылерыя. Штурмавікі скідаюць бомбы. Загараецца ангар, знішчаюцца некалькі «самалётаў», стаячых ля ангара. На вялікай вышыні з'яўляюцца 18 бамбавозаў, прыкрываемых знішчальнай авіяцыяй. Зноў ярасны агонь артылерыі. Завязваецца паветраны бой паміж знішчальнікамі абароны аэрадрома і нападу.

Аэрадром у клубках густога чорнага дыму. І, калі ён рассейваецца, гледачы ўжо не бачаць ні ангара, ні падсобных, ні дапаможных пабудоў, ні большасці «самалётаў», відаць не паспеўшых узняцца ў паветра. Пажарная каманда выратоўвае ад агню астаткі каштоўнай маемасці. А ў паветры прадаўжаецца ярасны «бой». Гледачы дружна апладыруюць выдатнаму майстэрству ваенных лётчыкаў.

Над полем — тры знішчальнікі. Іх пілатуюць палкоўнік Осіпенка, капітан Антонаў, старшы лейтэнант Шолахаў. Палкоўнік Осіпенка бясстрашна «б'ецца» з двума нападаючымі на яго лётчыкамі.

Увага ўсіх гледачоў прыкавана да маленькага белага самалёта. З надзвычайнай лёгкасцю на значнай вышыні ён выконвае складанейшыя фігуры вышэйшага пілатажа. Самалётам кіруе старшы лейтэнант Шолахаў, які паказвае майстэрства совецкіх лётчыкаў-знішчальнікаў.

На гарызонце 5 знішчальнікаў. Галаўны самалёт вядзе Герой Совецкага Саюза палкоўнік Сероў. Яны паказваюць фігуры групавога пілатажа.

Знішчальнікі адыходзяць. Магутны гул матораў напаўняе паветра. З'яўляюцца тры гіганцкія паветраныя караблі Момант — і неба запаўняецца шаўковымі купаламі. Дзесяткі парашутыстаў прыгнулі з самалётаў.

Свята скончана. Гэта быў грандыёзны парад магутнасці совецкай авіяцыі, выдатнай тэхнікі совецкай авіяцыйнай прамысловасці, бязмежнай адвагі і майстэрства совецкіх лётчыкаў, гатовых у любую мінуту грудзьмі стаць на абарону свяшчэнных граніц сваёй маці-радзімы. Гэта было свята сталінскага племені крылатых людзей.

(БЕЛТА).

Літаратурны календар

А. А. ДЭЛЬВІГ

(6-VIII (ст. ст.) 1798 г. — 14-1 (ст. ст.) 1831.).

Сто сорак год таму назад нарадзіўся ў Маскве ў сям'і ваеннага плац-маёра будучы паэт і блізкі прыяцель А. С. Пушкіна—Антон Антонавіч Дэльвіг. Паэт паходзіў з старасвецкага роду нямецкіх баронаў. Маці яго была руская (Красільнікава). Як і Пушкін, А. Дэльвіг выхоўваўся ў Царскасельскім ліцэі і скончыў яго разам з А. Пушкіным. Як і А. Пушкін, надрукаваў свой першы верш у 1814 годзе, але на месяц раней за свайго славутага прыяцеля. Службовая кар'ера яго была няўдалаю. Ні міністэрства фінансаў, ні міністэрства ўнутраных спраў, у якіх ён служыў, не прыцягвалі яго. Пяць год працаваў ён памочнікам бібліятэкара ў імператарскай публічнай бібліятэцы пад кіраваннем вялікага байкара Крылова.



Яшчэ будучы ў ліцэі, А. Дэльвіг браў самы актыўны ўдзел у рукапісных часопісах. А. Пушкін, Баратынскі, Вяземскі складалі магутную кучку паэтаў, у якой Дэльвіг адыгрываў далёка не апошнюю ролю, наадварот, як рэдактар і выдавец твораў названых паэтаў і лепшага, што з'яўлялася ў тагачаснай рускай паэзіі, ён стаяў у цэнтры яе. Але не толькі як выдавец адыгрываў сваю ролю ў пушкінскай плеядзе паэтаў, — А. Дэльвіг перш за ўсё быў паэтам. Руская паэзія абавязана іменна яму ўвядзеннем цэлага раду новых рыфмаў і формаў верша. Пад выключным уплывам А. Дэльвіга развіваўся паэт Баратынскі. Не без уплыву яго асталася і ранняя творчасць А. С. Пушкіна з боку яе формы.

Пад моцным уплывам яго песень пісаў свае захапляючыя, самотныя песні паэт народа А. Кальцоў.

Напісана А. Дэльвігам блізка ста сямідзесяці вершаў, з якіх за жыццём паэта свет убачыла толькі не больш сотні. Выдатны творца паэтычнай формы аднак разумеў сваю ролю і не ставіў сябе надта высока. Сябе ён называў толькі звычайным песняром. Затое ў асобе А. С. Пушкіна яшчэ на школьнай парце ён прадбачыў вялікага паэта і ў сваім вершы «А. Пушкіну» з захапленнем славіў паэтаву ліру. Да сёнешняга дня забыты ці напалову забыты ўсе яго элегіі, оды, ідыліі, пароды, эпіграмы і пасланні і толькі песні захаваліся ў народзе і спяваюцца і дагэтуль яго «Пела, пела пташечка», «Ах ты ночь ли ноченька», «Не осенний мелкий дождичек», «Я вечер в саду младешенька гуляла» і іншыя. Адным з першых ён культывуе ў рускай паэзіі форму сюжэта, і нават А. Пушкін значна пазней звяртаецца да гэтае формы.

А. Дэльвіг быў паэтам, які ўслаўляў у сваіх творах чыстае мастацтва. Яго творы пазбаўлены грамадскіх матываў і мабыць таму не падзяліў ён лёсу сваіх прыяцеляў Пушкіна (сасланне), Баратынскага (расжалаванне ў салдаты) і інш.

Вялікае значэнне А. Дэльвіга як рэдактара і выдаўца «Северных цветов» і «Литературной газеты», і нямала непрыемнасці давялося яму выцерпець за гэтыя часы. І калі «Северные цветы» трымаліся рознымі рэдакцыйнымі хітрыкамі, як друкаванне побач будыруючых твораў А. С. Пушкіна паэтаў другарадных, а часам і рэакцыйных для замарачэння галавы шматлікім цэнзарам, якія не раз кваліліся сарваць прыгожыя паўночныя кветкі, «Литературной газете» не пашанцавала. Па даносу вядомага шпіёна ад літаратуры Булгарына, А. Дэльвіга адхілілі ад кіравання ёю, выклікалі ў III аддзяленне, пасля чаго ён захварэў і неўзабаве памёр. І многія, і ў тым ліку А. Пушкін, у гэтым выкліку да жандармаў бачылі прычыну смерці паэта і свайго прыяцеля. У лісце да П. А. Плятнёва 21 студзеня 1831 г. Пушкін пісаў: — «Што скажу табе, мой любы! Жахлівую вестку атрымаў я ў нядзелю. На другі дзень яна пацвердзілася. Самотна, туга! Вось першая смерць мною аплаканая. Карамзін пад канец быў мне чужы; я глыбока шкадаваў яго як рускі, але нікога не было мне бліжэй за Дэльвіга. З усіх сувязей дзяцінства ён адзін заставаўся на воку — каля яго збіралася наша бедная кучка. Без яго мы быццам пасірацелі...»

Імя Дэльвіга праходзіць праз усю перапіску А. Пушкіна. Дэльвіг быў тым чалавекам, які мог належным чынам ацаніць прыгожае тварэнне чалавечага інтэлекта, з захапленнем адчуць пачуцці вялікага сэрца ў паэтавым вершы і зразумець чалавека. Некаторыя даныя гавораць нам, што суб'ектыўна па-за формаю і зместам сваіх вершаў Дэльвіг быў інакшым чалавекам, і зноў-такі пра гэта можна даведацца з ліста Пушкіна Дэльвігу ад 23/VII 1825 г., у якім гаворыцца зусім выразна:

«Зараз даведаўся, што ты мне пісаў, але ліст твой да мяне не дайшоў... Я надзвычай за цябе баюся; ці не сказаў ты чаго-небудзь лішняга ці неабдуманага; прыхільнасць сяброўства можна вытлумачыць дрэнным чынам — а я баюся быць прычынай непрыемнасці для лепшых з сяброў маіх».

Такім чынам, у прыватным жыцці Дэльвіг быў зусім не пазбаўлены здольнасці ацаніць і з'явы грамадскага парадку, што зусім не магло ўпадабацца ахранцы, і таму вельмі часта, даведваемся мы з перапіскі А. С. Пушкіна, лісты Дэльвіга не даходзілі да яго.

У лістах сваіх да А. Пушкіна ён гаварыў не толькі пра літаратуру. Вось чаму імі асабліва цікавілася ахраннае трэцяе аддзяленне. Пры ўсёй сваёй асцярожнасці А. Дэльвіг не мог заплюшчыць вочы на тагачаснае становішча грамадскай думкі і літаратуры ў Расіі. 28 верасня 1824 года ён пісаў А. Пушкіну ў Міхайлаўскае:

«Няма нічога больш нуднага за цяперашні Пецербург. Уяві, нават простых балаўнікоў няма! Квартальных няма каму біць. Мёртва і халодна, — або інакш: свежа і прахладна! З прыездам Военкава з Дэрпта і з з'яўленнем Булгарына літаратура наша зусім загіне. Падлюга на падлозе падлюгу паганяе».

Нездарма называў яго А. Пушкін у адным з сваіх вершаў братам названым, Дэльвіг быў яму братам па духу. Але ў вершах Дэльвіга можна ўлавіць толькі напамінак пра неспакойную душу паэта, не больш. Напрыклад у вершы «Жаваронак» ён піша:

С какою ты сладостию
Зарю величаешь!
Томлением, радостию
Мне душу стесняешь
Больную, измученную!
. . . . . .
Как ловит растерзанная
Душа его звуки!
И сладко утешенная,
На миг забыв муки
На небо не жалуется!

Гэта толькі напамінак аб сапраўдным душэўным стане паэта, а не раскрыццё яго. І калі ў дадатак мы ўспамянем пра высокую прынцыповасць А. Пушкіна і адначасна вялікае сяброўства яго з Дэльвігам, дык нам асвятліцца трохі з новага боку асоба паэта і чалавека А. А. Дэльвіга, душа якога імкнулася з цяжкіх кайданаў самаўладства, з цяжкіх кайданаў расійскай няволі, дзе чалавечы дух і імкненне былі прыгнечаны і задушаны.

Р. МУРАШКА.

НА СХОДЗЕ РАБОТНІКАЎ ОПЕРНАГА ТЭАТРА БССР

19 жніўня ў Доме партактыва адбыўся агульны сход работнікаў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. На сходзе прысутнічалі сакратары ЦК КП(б)Б тт. Панамарэнка, Грэкава і старшыня СНК БССР т. Кісялёў.

З інфармацыямі аб плане работы тэатра ў зімовым сезоне 1938-39 гг. выступілі дырэктар тэатра тав. Ярыкаў і галоўны рэжысёр тав. Рапапорт.

У абмеркаванні работы тэатра прынялі ўдзел работнікі калектыва оперы і балета тт. Піно, Архіпаў, Івакін, Бабаін - Ордынскі, Бахаўцоў і Габаеў.

Выступаючыя таварышы адзначылі, што стварэнне Дзяржаўнага беларускага тэатра оперы і балета і напісанне новых арыгінальных твораў для гэтага тэатра з'яўляецца вялікай перамогай беларускага народа, які, дзякуючы няўхільнаму правядзенню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, змог дабіцца такіх вялікіх дасягненняў на фронце культуры, нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу. Але побач з гэтым таварышы рэзка крытыкавалі бязладдзе, якое панавала да гэтага часу ў рабоце тэатра. Таксама было адзначана, што рэпертуарны план не адпавядае ўсім патрабаванням, якія прад'яўляюць творчыя работнікі тэатра да гэтага плана. Зусім не вызначаны тэрміны, у якія будуць пастаўлены запланіраваныя спектаклі.

На сходзе работнікаў тэатра выступіў з прамовай першы сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка. У сваім выступленні ён адзначыў, што Беларускаму тэатру оперы і балета, як і ўсяму мастацтву савецкага народа, партыяй і ўрадам створаны ўсе як матэрыяльныя, так і маральныя ўмовы для плённай творчай работы. Калектыву работнікаў неабходна наладзіць творчую работу, ліквідаваць тыя недахопы, што мелі месца ў жыцці тэатра. Неабходна, каб усе работнікі дапамаглі кіраўнікам тэатра наладзіць сістэматычную работу калектыва. Трэба працаваць не складаючы рук, памятаючы аб тым, што вынікі сваёй работы Тэатрам оперы і балета будуць паказаны ў Маскве нашаму вялікаму правадыру таварышу Сталіну.

Па ініцыятыве заслужанай артысткі БССР тав. Александроўскай, якая абяцала падрыхтаваць рад канцэртных нумароў, прысвечаных 20-годдзю ленінска-сталінскага комсамола, усе работнікі абяцалі на гэтым сходзе актыўна ўключыцца да падрыхтоўкі мастацкіх твораў, прысвечаных слаўнаму дваццацігоддзю.

АБ ПОЛАЦКІМ КАЛГАСНЫМ ТЭАТРЫ

Калгасна-соўгасныя тэатры створаны для культурнага абслугоўвання калгаснікаў.

Наш Полацкі калгасны тэатр існуе каля трох год. Тэрмін не малы. За гэты час тэатр мог-бы аформіцца, мог-бы стварыць рад цікавых спектакляў.

Але гэтага, нажаль, не зроблена, з прычыны існуючага несур'ёзнага, дылетанцкага кіраўніцтва тэатрам

Многія рэжысёры — апрабіраваныя і не апрабіраваныя — спрабавалі свае сілы ў Полацкім калгасным тэатры. Але вынікі іх работы сумныя. Рэжысёр Ліліна нічога не пакінула ў творчую спадчыну тэатру, апрача блытанага ўяўлення аб рабоце над сцэнічным вобразам. Апошні мастацкі кіраўнік тэатра — Гнаенскі давёў тэатр да творчай пасіўнасці і творчага супакаення. Пастаноўкі, якія ёсць у рэпертуары тэатра («Вочная стаўка», «Год 19», «Беспасажніца») стаяць на вельмі нізкім мастацкім узроўні. Рэжысёр ва ўсіх спектаклях не дабіваўся праўды пачуццяў, не дапамог актору ствараць вобразы вострых сацыяльных характараў, не стварыў талковых, апраўданых мізансцэн, не акцэнтыраваў патрэбныя сэнсавыя месцы ўсіх п'ес і т. д.

Недахоп рэжысёра Гнаенскага заключаецца ў тым, што ён зусім не працаваў з акторамі, не ўдумваўся глыбока ў сутнасць мастацкіх вобразаў, а таму не спаяў актораў у адзіны творчы ансамбль.

Крыўдна нам, працаўнікам Полацкага калгаснага тэатра, што аб нашых спектаклях ні адной рэцэнзіі не напісана кваліфікаванымі тэатральнымі крытыкамі. Дзелавая крытыка значна дапамагла-б фарміраванню і росту актора.

Акторы Полацкага тэатра жывуць і працуюць па-за творчым кантролем. Растуць яны ці не, добра зроблены вобраз ці дрэнна — гэтага яны самі сказаць не могуць. Патрэбна старанна кваліфікаванае вока. А ў Полацкім тэатры ёсць шмат здольных актораў, як Масцераў, Сярогін, Сумейка, Сярогіна, Лабакаў, Патаповіч, Мальцава і інш., якім неабходна творчая дапамога, творчы кантроль іх работы.


Упраўленне па справах мастацтваў павінна прысылаць на кожную прэм'еру, выпускаемую тэатрам, кваліфікаванага тэатральнага крытыка.

Полацкаму тэатру патрэбен добры мастацкі кіраўнік, які ўмеў-бы выхоўваць і расціць актораў, умеў-бы правільна распрацаваць пастаноўку, правільна даваць характарыстыкі вобразам. Маладыя акторы адчуваюць вялікую патрэбу ў гэтым, яны жадаюць ісці па правільнаму творчаму шляху, а не быць афярай нізкапробнага рэжысёра.

У рэпертуар тэатра безумоўна павінны ўвайсці беларускія п'есы (зараз там няма ні аднэй). Канцэрт павінен папоўніцца харавымі народнымі песнямі, пляскай, былінамі і т. д.

Пры правільным мастацкім кіраўніцтве, пры правільна арганізованай рабоце, пры добрым наглядзе з боку Упраўлення па справах мастацтваў,—тэатр можа расці, можа даваць добрыя спектаклі і канцэрты свайму калгаснаму гледачу.

Вас. МІЦІН,



«НА БАРЫКАДАХ 1905 ГОДА» — скульптура, выстаўленая ў філіяле музея В. І. Леніна ў Кіеве. Работа скульптараў: Мухіна, Ткачова, Блажэвіча.

ЭКСПЕДЫЦЫЯ АКАДЭМІІ НАВУК ПА ЗБОРУ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

У Бабруйскі, Парыцкі і Глускі раёны выехала фальклорна-этнаграфічная экспедыцыя Акадэміі навук БССР.

У плане экспедыцыі — вывучэнне і збіранне матэрыялаў па савецкаму і дарэвалюцыйнаму фальклору, а таксама збіранне твораў народнага выяўленчага мастацтва і танцаў.

У складзе экспедыцыі 10 чалавек, сярод іх — этнографы, фалькларысты і мастакі.

Асаблівая ўвага будзе звернута на збіранне фальклору з жыцця беларускіх рабочых, для чаго на прадпрыемствах гор. Бабруйска будзе праведзена шырокая работа.

Для запісу музыкальнага фальклору запрошаны навуковыя працаўнікі Акадэміі навук СССР — музыканты-этнографы (кампазітар Рубцоў і С. Д. Магід). Экспедыцыя мае спецыяльную гуказапісваючую апаратуру.

Сабраны матэрыял будзе скарыстан у падрыхтоўваемых Акадэміяй навук БССР фальклорных зборніках і ў альбоме ўзораў беларускага народнага мастацтва.

Экспедыцыя прадоўжыцца 1—2 месяцы.

РАБОТА ЦЫРКА

Цыркавыя паказы ў СССР з кожным годам набываюць усё большую любоў і папулярнасць у масавага гледача. Поспех цырка не выпадковы. Савецкая цыркавая школа — адзіная ў свеце школа, выпускаючая кваліфікаваных работнікаў манежа, самых разнастайных цыркавых жанраў. Маладыя савецкія актеры цырка дасягнулі за апошнія гады такога майстэрства тэхнікі і вынаходлівасці, што нашыя арэны не залежаць больш ад замежных атракцыёнаў, так званых «гвазддоў» праграмы, без якіх раней не абыходзілася ні адно цыркавое відовішча. Аб гэтым ясна сведчаць выканаўцы праграмы, прадстаўленай у Менскім дзяржцырку ў гэтым сезоне. Тым больш незаслужаным з'яўляецца некаторая адчужанасць работы гэтага важнага ўчастка мастацтва ад усяе работы відовішчных прадпрыемстваў Беларусі. У друку часта можна чытаць артыкулы і крытычныя заўвагі аб Тэатры оперы і балета, аб беларускіх драматычных тэатрах. Але нічога няма аб цырку (калі не лічыць некалькі кароткіх аглядаў праграмы).

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР зусім не цікавіцца работай цырка, бадай, з тае прычыны, што беларускі цырк знаходзіцца ў сістэме саюзнага упраўлення дзяржцыркам і падпарадкуецца непасрэдна Маскве, г. зн. знаходзіцца нібы на становішчы гастраліруючага прадпрыемства. Гэта глыбока памылкова. Цырку патрэбна вялікая творчая дапамога, і яна ў першую чаргу павінна быць аказана на месцах.

Памяшканне менскага цырка шапіто знаходзіцца ў такім стане, што ў часе дажджу прыходзіцца спыняць паказ і глядач вымушан ратавацца ў такіх рэдкіх месцах, дзе яго не палівае халодны душ. Нясвоечасовае правядзенне рамонту можа прывесці да таго, што ў 1939 годзе ў БССР будзе сарваны ўвесь цыркавы сезон. Гэтага нельга дапусціць, бо поўныя зборы ў менскім Шапіто лішні раз падкрэсліваюць, наколькі высока цэніць наш глядач цыркавыя відовішчы.

Трэба адзначыць, што работа цырка не абмяжоўваецца адной арэнай. Увесь цыркавы калектыў, кіруемы дырэктарам тав. Кабішчэрам, праводзіць вялікую работу на выездах у ваенныя і піонерскія лагеры. Сваім удзелам у выбарчай кампаніі і ў абслугоўванні дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР работнікі цырка дабіліся таго, што ў сваёй «Кнізе водзываў» могуць з гордасцю чытаць наступныя радкі:

«Усе нумары выкананы чотка і прыгожа. Здзіўляе вялікі культурны рост цырка. Совецкі народ мае дастойнае мастацтва і цудоўных совецкіх артыстаў.

Камандуючы войскамі БВА дэпутат Вярхоўнага Совета БССР КАВАЛЕЎ».

«Праграма арганізавана не дрэнна. Я многа бываў у цырку, але такіх нумароў яшчэ не бачыў. Гэта людзі лепшага мастацтва.

Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР конюх ЛЫСЕНКА».

«Нумары пакідаюць цудоўнае ўражанне. Гэта вечар вясёлага і культурнага адпачынку.

Дэпутат Вярхоўнага Совета СССР НАВІЦКІ».

Падобныя запісы ў «Кнізе водзываў» цырка пакінулі многія дэпутаты народнага парламента.

Гаворачы аб удзельніках апошняй цыркавой праграмы, у першую чаргу хочацца адзначыць выдатны атракцыён Рудэіф, які наглядна паказвае рост совецкай цыркавой школы. На ідучай пад купал калыхаючайся пальме артыст са здзіўляючай лёгкасцю робіць складаныя акрабатычныя трукі.

Нажаль, па ўмовах памяшкання, «пальма» значна скарочана, што некалькі зніжае эфект нумара. Не менш эфектны выхад Лісіна і Сіньхоўскай. Гэта цудоўныя тэмпераментныя паветраныя акрабаты. Узоры чыстай, свабоднай і ў той-жа час складанай работы паказваюць турністы Кальцаны, якія заслужана выклікаюць захапленне ў гледачоў. Добрыя акрабаты Мільтанс, менш удала выходзячыя затым у нумары «акрабаты-няўдачнікі». Весела і чотка працуюць жанглёры Баўман. «Вузкім» месцам цыркавых праграм з'яўляецца размоўны жанр. Не зусім справядліва заўсёды абвінавачваць у гэтым выканаўцаў. Браты Гаварашчыя, прадстаўляючыя гэты жанр, пры ўсім сваім імкненні да адшуквання новых формаў, цалкам залежаць ад рэпертуара, які ёсць у іх, пры тым большай часткай невысокай якасці. Дасціпна запаўняе паузы Сенічка Радзькін. Размоўнаму жанру нехапае дапамогі вопытнага рэжысёра-пастаноўшчыка, і Упраўленне па справах мастацтваў гэтую дапамогу магло-б аказаць. Самым бязрадасным месцам праграмы з'яўляецца... цыркавы аркестр.

Мала таго, што яго гучанне пакідае жадаць шмат лепшага, — старыя рэчы, якія выконваюцца ім, яўна ідуць у разрэз з добрымі, бадзёрымі нумарамі выканаўцаў. У гэтым асноўная віна дырыжора Златкевіча, які да таго-ж сваёй манерай дырыжыравання толькі разладжвае аркестр. Выклікае недаўменне і адзіны светавы эфект, аднолькавы для кожнага выхаду.

Работнікі мастацтва Беларусі павінны дапамагчы цырку ў яго пошуках, накіраваных на стварэнне захапляючага відовішча, якое будзе па праву заваёўваць за совецкім цыркам месца лепшага цырка на свеце.

Марк ФРАДКІН.

ГАСТРОЛІ КАРЭЛЬСКАГА КАНТЭЛЕ-АНСАМБЛЯ Ў БССР

Наш кантэле-ансамбль з вялікай ахвотай сустрэў прапанову беларускай Філармоніі аб гастролях па БССР. Перад намі ўстала адказная задача — азнаёміць братні беларускі народ з народнай творчасцю Карэліі. Ансамбль пачаў свае гастролі ў знамянальную дату, — у дзень пятнаццацігоддзя Карэльскай Аўтаномнай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і ў дзень усенароднай радасці адкрыцця Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР—25 ліпеня.

За час гастролей па БССР было праведзена 22 выступленні і абслужана звыш 15.500 гледачоў. Калектыў наведаў Магілеў, Друць, Оршу, Белдрэс, Асінторф, Горкі, Мсціслаўль, Крычаў, Клімавічы, Касцюковічы. Усюды беларускі народ сустракаў нас гасцінна. На Асінторфе нашы артысты пазнаёміліся са здабычай торфу. Разам з рабочымі тарфянікамі ў адказ на правакацыйныя ўчынкі японскіх бандытаў мы далучылі свой голас пратэсту да ўсяго совецкага народа і абяцалі па першаму закліку партыі і ўрада змяніць свае музычныя інструменты на вінтоўкі, каб грудзьмі абараніць сваю любімую радзіму.

У Касцюковічах быў арганізаваны бясплатны канцэрт, які слухала і глядзела 400 дзяцей і надзвычай добра прынялі выступленне артыстаў. Піонеры і школьнікі засыпалі сцэну букетамі кветак. Касцюковіцкая самадзейнасць сустрэлася з работнікамі кантэле-ансамбля, і на масоўцы, якая была праведзена за горадам, самадзейнасць і акторы абмяняліся творчым вопытам сваёй работы. Карэльскі калектыў усюды, дзе ён выступаў, дапамагаў беларускай самадзейнасці. Работнікі самадзейнага мастацтва ўключылі ў свой рэпертуар рад карэльскіх песень і танцаў. У сваю чаргу ансамбль у Горках прагледзеў і запісаў танец «Лявоніха», які будзе ўключаны ў праграму нашага калектыва.

Выступленне нашага кантэле-ансамбля было прынята беларускім народам цёпла.

Мы разглядаем нашу паездку, як адно з праяўленняў ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Раней прыгнечаныя народы былой царскай Расіі, цяпер аб'яднаныя ў вялікую братнюю сям'ю народаў СССР, будуюць сваю культуру, нацыянальную па форме і соцыялістычную па зместу.

Ансамбль зараз закончыў абслугоўванне гледачоў Дуброўны. 18 жніўня ён прыехаў у Менск, дзе дасць рад канцэртаў карэльскай музыкі, песні і пляскі.

НЕВЕЛЬСКІ,
упаўнаважаны Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК АКССР.

СПРАВЫ КАМБІНАТА ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

На працягу раду год у Менску існавала аб'яднанне «Белмастак». Мэтаю гэтай арганізацыі з'яўлялася творчае і вытворчае аб'яднанне беларускіх мастакоў, заказы і распаўсюджванне іх твораў. Але варожае кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў і Саюза совецкіх мастакоў БССР так накіравала дзейнасць «Белмастака», што яно поўнасцю дыскрэдытавала сябе ў вачах совецкай грамадскасці і ператварылася ў арганізацыю, якая нікому не была патрэбна.

Шматлікая колькасць дакладных запісак была напісана т. Райхманам (які быў дырэктарам «Белмастака») у Упраўленне па справах мастацтваў. Там абяцалі аказаць дапамогу, але абсалютна нічога канкрэтнага ў гэтым напрамку не рабілі. Прадастаўлены самому сабе, «Белмастак» не мог разгарнуць шырокай і сур'ёзнай работы. Ен жыў выпадковымі заказамі. Калі-ж здараліся заказы вялікія і сур'ёзныя, як помнікі для Барысава, Полацка, Гомеля, работы для выставак да 10-годдзя і 20-годдзя Кастрычніка, работы да сусветнага антырэўматычнага кангрэса і т. д., — «Белмастак» не мог іх выконваць, з тае прычыны, што ён не быў забяспечан неабходнай сыравінай і матэрыяламі. Сыравіна для аб'яднання нідзе не планіравалася.

Самое кіраўніцтва аб'яднання аказалася безыніцыятыўным і безадапаможным. За ўсе годы яго існавання не было нават спробы пабудаваць план яго работы. Толькі ў апошні год існавання «Белмастака» быў складзен план. Але... ён аказаўся поўнасцю пражэкцёрскім, не маючым пад сабою глебы рэальнага разліку.

Адзіная галіна, якая знайшла некаторае развіццё ў «Белмастаку», — вытворчасць масавай скульптуры і пап'е-машэ. Але характэрна, што бракеража па прыёмцы гатовай прадукцыі ў аб'яднанні не існавала. Ніякага кантролю не было і ні за іншай выпускаемай зрэдку аб'яднаннем прадукцыяй. Вынікам гэтага з'яўляўся выпуск нярэдка нізкаякаснай, халтурнай прадукцыі. Вельмі нездаровыя з'явы ў рабоце аб'яднання параджала адсутнасць усякіх тарыфаў і расцэнак (дарэчы, ЦП саюза работнікаў мастацтваў з года ў год «распрацоўвае» гэтыя тарыфы). Кошт прадукцыі і заработак мастакоў адвольна ўстанаўліваў былы камерцыйны дырэктар «Белмастака», вораг народа.

Развал работы аб'яднання, адсутнасць усякага імкнення прыцягнуць мастакоў, загрузіць іх творчай работай прывялі да таго, што беларускія мастакі адышлі ад «Белмастака», пачалі працаваць па іншых заказах. Мастакі наогул пачалі ігнараваць аб'яднанне, непасрэдна звязваючыся з заказчыкамі. Гэта выклікала факты рвацтва, халтуры. І гэта стварала атмасферу, якая дазваляла зацёсвацца ў асяроддзе мастакоў цёмным асобам. Напрыклад, нейкі Каржок займаўся тым, што прымаў ад гаспадарніка заказ і за пэўную «камісію» перадаваў заказ мастаку.

«Белмастак» больш не існуе. Рашэннем Соўнаркома аб'яднанне ліквідавана. Замест яго створаны камбінат выяўленчага мастацтва. Зусім не варта было-б зараз успамінаць пра дзейнасць ліквідаванага «Белмастака», калі-б... усе яго заганы не засталіся ў практыцы работы і новай арганізацыі — камбінаце выяўленчага мастацтва.

Сама ліквідацыя «Белмастака» адбылася без усякага ўдзелу мастакоў. Не быў нават скліканы сход па гэтаму пытанню. Праўленне аб'яднання не зрабіла справаздачы сваім членам.

А акт рэвізійнай камісіі аказаўся пахаваным у архівах Упраўлення па справах мастацтваў, дзе пахаронены такім чынам рад мерапрыемстваў, якія рэвізійная камісія і беларускія мастакі лічылі патрэбным зрабіць для ажыўлення новаарганізуемай арганізацыі.

Што аказалася на практыцы з рэарганізацыі «Белмастака» ў камбінат выяўленчага мастацтва? Новая арганізацыя засталася, таксама як і ранейшая, без сродкаў вытворчасці, без вытворчай базы, без фінансавых асігнаванняў. Упраўленне па справах мастацтваў фармальна выканала рашэнне Соўнаркома — рэарганізавала «Белмастак», а па сутнасці — пакінула ўсё ў тым-жа становішчы, як і было. Справа абмежавалася пераменаю шыльды. Той-жа т. Райхман імянуецца дырэктарам ужо камбіната і таксама праяўляе поўную безыніцыятыўнасць, як рабіў гэта будучы дырэктарам «Белмастака».

У камбінаце — паўнейшы застой. Месяцамі праз камбінат не праходзіць ні аднаго заказу. Адзіны і надзвычай важны палітычна-актуальны заказ — да дня выбараў у Вярхоўны Совет БССР — ганебна правалены дырэктарам камбіната тав. Райхманам. Замест таго, каб склікаць вытворчую нараду мастакоў па гэтаму пытанню (намячаўся выпуск у вялікім тыражы шматфарбных плакатаў да выбараў). Райхман даверыўся аматарскаму плану аднаго мастака, плану, які загадзя выклікаў сумненне. У выніку — былі выкінуты на вецер некалькі тысяч дзяржаўных грошай, і заданне не было выканана.

Пасля гэтай няўдачы, тав. Райхман ужо баіцца праяўляць якую-б там ні было ініцыятыву.

Вельмі шкодную блытаніну ўнеслі ворагі народа ў работу па афармленню беларускага павільёна на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Яны імкнуліся проціпаставіць беларускіх мастакоў майстрам іншых брацкіх рэспублік. Была зроблена спроба наогул ігнараваць работу беларускіх мастакоў над павільёнам. І толькі калі маскоўскія і ленінградскія мастакі адмовіліся выканаць складанейшыя жывапісныя пано ў немагчыма кароткія тэрміны, гэтую работу прапанавалі майстрам БССР.

Праектныя работы, заказаныя менскім мастакам, ішлі міма камбіната. Чамусь работа праводзілася не на конкурсных пачатках. Чэхарда вакол неаднаразова адвяргаемых праектаў унутранога афармлення каштавала дзяржаве дзесяткі тысяч рублёў.

Можна ўпэўнена сказаць: камбінат ні ў малейшай ступені не спраўляецца з задачай арганізацыі працы мастакоў, распаўсюджвання мастацкай прадукцыі па БССР.

Між тым неабходнасць такой арганізацыі зразумела. З кожным годам, разам з ростам матэрыяльных і культурных запатрабаванняў працоўных нашай ордэнаноснай рэспублікі, расце попыт і на творы мастакоў. Неабходна, каб камбінат выяўленчага мастацтва папулярызаваў творы мастакоў у народзе. Яму патрэбна вытворчая сапраўдная база. Неабходна, каб усе беларускія мастакі прынялі самы актыўны ўдзел у рабоце свайго камбіната. Упраўленне па справах мастацтваў павінна неадкладна ўмяшацца ў становішча камбіната.

Пры дапамозе і пры належным кіраўніцтве камбінат можа разгарнуць вялікую работу, якая арганізуе работу мастакоў, зблізіць іх з спажыўцамі іх твораў—працоўнымі БССР, забяспечыць выпуск на рынак высокаякаснай мастацкай прадукцыі, урэгулюе матэрыяльныя пытанні работы мастакоў.

У прыватнасці, мы лічым, што камбінату трэба звярнуць асаблівую ўвагу на наступныя работы: распаўсюджванне твораў станкавага жывапісу і скульптуры ў клубы і інш. арганізацыі—ніхто ніколі гэтым не займаецца. Арганізаваць пры камбінаце майстэрню керамікі і фабрыку цацак. Арганізаваць нанава майстэрню мастацкага роспісу тканіны— на базе вывучэння беларускага народнага арнамента, майстэрню партрэта, эксперыментальную майстэрню ўнутранага роспісу архітэктурных аб'ектаў, майстэрню дэкаратыўных афармленняў і афармлення народных святкаванняў.

Мы лічым, што па ўсіх закранутых тут пытаннях неабходна склікаць агульны сход мастакоў.

Н. К.

Нам. рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Е—5813.